

# ПЕРСПЕКТЫВЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ХЕРСОНСКАЙ ВОБЛАСЦЮ І ПРАФЕСІЙНАЯ АЦЭНКА ТАГО, ШТО АДБЫВАЕЦЦА НА ГРАНІЦЫ

**Панядзелак у Палацы Незалежнасці быў насычаны**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ВЕРАСНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 178 (30566)

# ХАЙ АЎТО АДПАЧНЕ

**Чаму варта далучыцца да Тыдня мабільнасці**



Галоўная мэта Тыдня мабільнасці, які пачынаецца сёння ў сталіцы, — прыцягнуць увагу да праблемы забруджвання навакольнага асяроддзя. А таксама нагадаць грамадзянам пра магчымасць часам адмаўляцца ад выкарыстання ўласнага аўтатранспарту і перамяшчацца на іншых сродках. Напрыклад, можна ўзяць на пракат або набыць сродкі персанальнай мабільнасці, веласіпед, паездзіць на работу на грамадскім транспарце. СТАР. 11

«ЗАХАД-2025»: ПОЎНАЯ АДКРЫТАСЦЬ 6



УЗРОВЕНЬ ЖЫЦЦЯ

## «КАБ МОЛАДЗЬ ЗАСТАВАЛАСЯ, ТРЭБА СТВАРАЦЬ УМОВЫ»

**Што робяць для гэтага ў Навагрудку**

Першае месца працы сёлета па ўсёй краіне атрымала каля 40 тысяч спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і каля 20 тысяч выпускнікоў з адукацыяй прафесійна-тэхнічнай. Дыпламаваныя супрацоўнікі — кваліфікаваныя, ініцыятыўныя — сёння асабліва запатрабаваныя ў рэгіёнах. СТАР. 10



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

# «МЫ ЎСЯЛЯК БУДЗЕМ САДЗЕЙНІЧАЦЬ РАЗВІЦЦЮ ВАШАЙ ВОБЛАСЦІ»

## Прэзідэнт — аб перспектывах супрацоўніцтва з новым расійскім рэгіёнам

Вітаючы губернатара Херсонскай вобласці Уладзіміра Сальда ў Беларусі, які ў нашай краіне не ўпершыню, але ў якасці губернатара першы раз, Аляксандр Лукашэнка агучыў канкрэтныя кірункі ўзаемадзеяння з гэтым расійскім рэгіёнам. Сярод іх — абмен вопытам у сельскай гаспадарцы і прамысловасці.



Фота БелТА.

### АД ПЛОДА-АГАРОДНІННАЙ ДА МАШЫНА-БУДАЎНІЧАЙ ПРАДУКЦЫІ

«Ведаю, вы хочаце пазнаёміцца з нашымі прадпрыемствамі і паглядзець на ўсё тое, што, магчыма, вам спатрэбіцца ў вобласці, — пачаў размову кіраўнік дзяржавы. — Я вельмі ўважліва назіраю, як развіваюцца падзеі на новых тэрыторыях Расіі. Вы гэта добра ведаеце, асабліва Херсонская вобласць. Гляджу за вашымі паездкамі. Мяне крыху здзіўляе тое, што ў гэтай сітуацыі, калі не проста пастрэльваюць, а ідзе вайна на вашай зямлі, вы і хлеб убіраеце, і займаецеся іншымі пытаннямі».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь усяляк гатова садзейнічаць Херсонскай вобласці ў будаўніцтве, развіцці сельскай гаспадаркі, пастаўцы неабходнай тэхнікі. «Я вельмі добра ведаю, якую ўвагу ўдзяляе Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін развіццю гэтых рэгіёнаў, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Ідзе прыстойнае фінансаванне».

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што па суадносінах цаны і якасці такой прадукцыі, як з Беларусі, для Херсонскай вобласці не будзе. «Тым больш, мы гатовы ствараць сэрвісныя цэнтры для таго, каб абслугоўваць нашу, перш за ўсё, прадукцыю машынабудаўнічага кірунку, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Калі вам нешта спатрэбіцца ў галіне сельскай гаспадаркі, вы скажыце, мы абавязкова будзем падтрымліваць з вамі адносіны ў гэтым плане».

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што і беларусы гатовы купляць у Херсонскай вобласці тое, што не вырабляецца ў нашай краіне. «Асабліва плодаагародніннную прадукцыю, — канкрэтызаваў Прэзідэнт. — Калі такая магчымасць ёсць, я гатовы накіраваць у Херсонскую вобласць спецыялістаў для таго, каб паглядзелі і абмеркавалі з вамі тое, што мы можам набыць».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што напярэдадні ў Беларусі і Херсонскай вобласці — вялікі аб'ём работы. «Вы павінны ведаць, што мы ўсяляк будзем садзейнічаць развіццю вашай вобласці. Настолькі, наколькі мы гэта зможам», — рэзюмаваў ён.

### НА ПЕРСПЕКТЫВУ РАЗВІЦЦЯ

Найперш губернатар Херсонскай вобласці Уладзімір Сальда перадаў беларускаму лідару словы падзякі ад херсонцаў, усіх жыхароў рэгіёнаў, якія вярнуліся на гістарычную радзіму.

«Мы ўсе бачым, колькі вы робіце для таго, каб было дасягнута ўзаемапаразуменне, для таго, каб на нашай зямлі працягвалася мірнае развіццё, — падкрэсліў губернатар. — Так, у нас цяпер няпроста, ідзе спецыяльная ваенная аперацыя. Але тым не менш, людзі жывуць, людзі працуюць (вы бачыце, ведаеце пра гэта), убіраюць хлеб, нягледзячы на тое, што праціўнік перашкаджае гэтаму, спрабуе перашкаджаць мірнаму працэсу. Тым не менш, парасткі мірнага жыцця прабіваюцца».

Уладзімір Сальда адзначыў, у Беларусі ён не адчувае сябе госцем. «Я прыехаў да сваіх сяброў», — удакладніў ён.

«Дык вы і не госць, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Мы з вамі — савецкія людзі, шмат працавалі ў адзінай дзяржаве. Гэта ваша зямля, так як Украіна і Херсонская вобласць — таксама мая зямля».

«У нас адзін народ, і будзем лічыць, што гісторыя так распарадзілася, што менавіта цяпер гэтыя палітычныя працэсы пачалі зрухі і нам пашанцавала жыць у гэты час, — дадаў губернатар Херсонскай вобласці. — Кожнаму дадзена жыць у свой час».

«Лепш мы, чым нашы дзеці і ўнукі», — заўважыў беларускі лідар.

Губернатар Херсонскай вобласці выказаў упэўненасць, што ў хуткім часе сітуацыя выйдзе ў мірнае рэчышча. «Гэта рабочая паездка накіравана на перспектыву развіцця, аднаўлення ўсяго таго, што, на жаль, разбурана», — канстатаваў ён.

# ШТО НА ГРАНІЦЫ? НЕ ПАЛІТЫЧНАЯ, А ПРАФЕСІЙНАЯ

## Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Дзяржаўнага мытнага камітэта

Уладзімір Арлоўскі праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб сітуацыі на Дзяржаўнай граніцы, мерах, якія прымаюцца з мэтай змяншэння чэргаў і камфортнага знаходжання ў іх. Ішла размова і аб выкарыстанні найноўшых тэхналогій у рабоце мытных органаў.

«Ну, што там адбылося ў вас на граніцы? — удакладніў у старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Прэзідэнт. — Кажуць, не хочаце вы аўтамабільны транспарт прапускаць. Не ведаю — туды або назад. Чэргі ўтварыліся. Што там палякі дзівачаць? Не палітычная, а прафесійная ацэнка: што там з імі адбываецца? Гэта першае пытанне. Хачу, каб мне далажылі аб сітуацыі на граніцы з пункту гледжання мытні».

Другое пытанне, якое абазначыў Аляксандр Лукашэнка, было звязана са спыненнем злачыннасці на Дзяржаўнай граніцы. «Усё ж такі паскудзяць яны прыстойна, — кажучы аб дзеяннях шэрагу сумежных краін, заўважыў беларускі лідар. — І наркотыкі, і выбуховыя рэчывы, і іншае праз граніцу перамяшчаецца. Нядаўнія затрыманні наркатычных сродкаў, узрыўчаткі, якая, кажуць, ішла не да нас, а ў Расію... Што там у нас адбываецца?»

Трэцяе пытанне, на якім засяродзіў увагу Прэзідэнт, датычылася выкарыстання найноўшых тэхналогій у рабоце мытных органаў. «Як выкарыстоўваем лічбавізацыю (модна казаць), можа, штучны інтэлект для таго, каб больш эфектыўна працаваць на граніцы?» — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы і пацікавіўся ў старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта перспектывай сітуацыі, якая склалася на Дзяржаўнай граніцы.

## Даслоўна

### «Беларускі бок гатовы да аднаўлення работы ў любым пункце пропуску»



Каментуючы сітуацыю на дзяржаўнай граніцы, **старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ** нагадаў журналістам, што польскі бок ужо не першы раз закрывае пункты пропуску, але ў ноч на 12 верасня Польшча поўнасцю закрыла граніцу з Беларуссю. «Калі закрыццё часовае, то моцна гэта не адаб'ецца ў цэлым на грузапатоку, — адзначыў ён. — Пацерпяць звычайныя людзі, якія не паспелі на адпачынак, у камандзіроўку, па пэўных сямейных справах. Частка з іх выехала праз літоўскі напрамак, частка адмяніла паездкі. Непрыемна для людзей, але, на жаль, польскі бок на гэта ўвагу не звяртае».

Уладзімір Арлоўскі праінфармаваў, што транспарт, які рухаецца праз дзяржграніцу ў літоўскім і латвійскім напрамках, нашы мытныя органы афармляюць максімальна хутка. Там, дзе ствараюцца чэргі па прычыне дзеянняў сумежных краін, створаны ўмовы для чакання.

Кажучы аб кантактах па лініі мытных службаў, кіраўнік ведамства адзначыў, што ў апошнія гады ні з Польшчай, ні з Літвой, ні з Латвіяй іх практычна няма. «Засталіся толькі кантакты на лініі граніцы непасрэдна ў пунктах пропуску, і тое яны звязаны з тэхнічнымі пытаннямі, — удакладніў ён. — Мы бачым, як дзейнічае сумежны бок, і дзейнічаем самі, рэагуючы ўжо непасрэдна на іх дзеянні. Закрылі пункт пропуску — мы пераразмяркоўваем грузапатокі, пасажырапатокі, сваіх супрацоўнікаў для работы ў пунктах пропуску. Мы ад дыялогу не адмаўляемся і гатовы гэты дыялог у любы час, у любым фармаце аднавіць. Але, на жаль, сумежны бок пакуль ад такога дыялогу адмаўляецца».

Уладзімір Арлоўскі акцэнтаваў увагу на тым, што беларускі бок гатовы да аднаўлення работы ў любым пункце пропуску, калі сумежныя краіны прымуць такое рашэнне. «Калі будзе на тое добрая воля нашых суседзяў — мы гатовы, — падкрэсліў ён. — У нас і асабовы склад ёсць, і ўсё засталося на месцах. Які б пункт пропуску ні быў адкрыты, мы гатовы літаральна ў лічаныя гадзіны заняць працоўнае месца і ажыццяўляць пропуск і кантроль».

Датычна сістэмы электроннай чаргі кіраўнік ведамства адзначыў, што яна стваралася некалькі гадоў. «Рашэнне сумежных краін аб закрыцці пунктаў пропуску стала нечаканасцю, таму адразу было складана стварыць камфортныя ўмовы па ўсёй лініі граніцы, — удакладніў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта. — Але мы паслядоўна стварылі каля кожнага пункта пропуску адпаведную пляцоўку з усімі ўмовамі для чакання перасячэння граніцы: кафэ, Wi-Fi і г. д.».

Па словах Уладзіміра Арлоўскага, заканчваецца будаўніцтва дзвюх буйных пляцовак. Першая з іх — для грузавікоў перад пунктам пропуску «Казловічы». Пляцоўка ўключае каля 800 машына-месцаў. Яе здача плануецца ў студзені 2026 года. Акрамя таго, у снежні 2025-га плануецца здаць пляцоўку перад пунктам пропуску «Варшаўскі мост». «Гэта самае напружанае месца, дзе апошнія два месяцы чэргі дасягалі 8-10 дзён чакання, — адзначыў Уладзімір Арлоўскі. — Там таксама робім пляцоўку і ствараем камфортныя ўмовы».

Кажучы аб перспектывах развіцця, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта праінфармаваў, што разглядаецца магчымасць стварэння такой прагрэсіўнай сістэмы, як дыстанцыйная рэгістрацыя без заезду на пляцоўку.

## Даслоўна

### Ад машынабудавання і сельскай гаспадаркі — да турызму

У размове з журналістамі **губернатар Херсонскай вобласці Уладзімір САЛЬДА** звярнуў увагу на тое, што Херсонская вобласць — гэта аграрны рэгіён, які на цяперашнім этапе патрабуе істотнага абнаўлення парка сельскагаспадарчай тэхнікі. Ён праінфармаваў, што большая частка іх тэхнікі — заходняй вытворчасці. З-за адсутнасці доступу да запчастак тэхніка практычна не працуе. У гэтай сувязі Херсонская вобласць разлічвае аднавіць кааперацыю з беларускімі прадпрыемствамі.

«Аляксандр Рыгоравіч дакладна сказаў: вы пазнаёміцеся з усімі нашымі распрацоўкамі, прадпрыемствамі, якія вырабляюць сусветна вядомую прадукцыю, — агучыў дэталі перагавораў з беларускім лідарам губернатар. — Няма, напэўна, такога населенага пункта або вёскі ў Херсонскай вобласці, як і ва ўсёй нашай неабсяжнай Радзіме, дзе не ведалі б, што такое трактар «Беларус». Беларуская машынабудаўнічая галіна паказвае, што яна ўмее вырабляць самыя сучасныя ўзоры тэхнікі».



Уладзімір Сальда адзначыў, што, нягледзячы на баявыя дзеянні на тэрыторыі Херсонскай вобласці, жыхары рэгіёна займаюцца сельскай гаспадаркай. «Разглядаецца і ўжо праектуецца стварэнне тэхнапарка ў Херсонскай вобласці, — праінфармаваў ён. — Менавіта на тэрыторыі гэтага тэхнапарка мы ўжо агаворваем магчымасць паставіць тэхнічныя цэнтры абслугоўвання беларускай тэхнікі, якая знойдзе сваё месца сярод прадстаўнікоў аграрнага бізнесу».

Патрэбны херсонскім аграрыям калійныя і іншыя ўгнаенні беларускай вытворчасці. Кажучы аб узаемным інтарэсе, Уладзімір Сальда нагадаў, што Херсонская вобласць славіцца прадукцыяй сельскай гаспадаркі. «Гэта вырашчаная на паўднёвых землях агародніна, садавіна, таксама вядомыя на ўсёй вялікай прасторы былога Савецкага Саюза, — канкрэтызаваў ён. — Гэта памідоры, кавуны, дыні, персікі, інжыр і ўсё, што расце ў нашых паўднёвых краях».

Вялікія перспектывы супрацоўніцтва і ў турыстычнай сферы. «У Херсонскай вобласці ёсць узбярэжжы двух мораў — Азоўскага і Чорнага, — канстатаваў губернатар. — Гэта цудоўныя месцы для адпачынку: запаведнікі, тэрмальныя крыніцы». Аднаўленне ўсёй гэтай сістэмы адпачынку, санаторна-курортнага лячэння таксама абмяркоўвалася падчас сустрэчы губернатара гэтага рэгіёна з Аляксандрам Лукашэнкам. Херсонская вобласць гатова выдзеліць беларусам месцы для адпачынку. Размова ідзе і пра перадачу часткі ўзбярэжжа беларусам, каб мы пабудавалі там свае базы, санаторыі, якія будуць карысныя жыхарам Беларусі.

**Вераніка КАНЮТА.**

## АЦЭНКА

Уладзімір Арлоўскі адзначыў, што сітуацыя складаная. «Нягледзячы на гэта, усё, што ўязджае да нас у краіну (грузы, легкавыя машыны, фізічныя асобы), мы афармляем максімальна хутка, — праінфармаваў ён. — Вядома, кантроль ёсць, абавязковы, але спецыяльнай затрымкі часу не дапускаем. Што датычыцца выезду з краіны, тут, вядома, усё залежыць ад сумежнага боку. Колькі бяруць — столькі мы і афармляем на выезд. Бяруць мала».

«Ты кажы канктрэтна. А то падумаюць, што бяруць хабар і іншае...», — заўважыў Прэзідэнт.

«Прапускаюць аўтамабіляў да сябе нашмат менш, у разы менш, чым устаноўлена нашымі пагадненнямі, — канкрэтызаваў Уладзімір Арлоўскі. — Па грузавіках на літоўскім кірунку — да 100 грузавікоў, хоць можам афармляць 500—600».

«Яны паабяцалі больш, як вы кажаце, браць для афармлення грузаў, але бяруць значна, у разы менш. Гэта значыць, яны парушаюць пагадненне?» — удакладніў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік ведамства пацвердзіў, што пагадненне парушаецца. «Прычым наўмысна прымаюць менш, — падкрэсліў ён. — Уся інфраструктура ёсць (і пункты пропуску, і тэхніка), таму робіцца гэта наўмысна. Раз прымаюць аўтамабіляў менш — адпаведна, чэргі на нашым баку ўтвараюцца».

«Мы дамаўляліся, што вы ўведзяце электронны кантроль, электронную чаргу, каб людзі не стаялі, а дзесьці знаходзіліся, у тым ліку дома, а вы іх інфармуеце, калі яны праедуць», — нагадаў пра ранейшыя дамоўленасці беларускі лідар.

«Так і зрабілі, таварыш Прэзідэнт», — запэўніў Уладзімір Арлоўскі. Ён удакладніў, што для камфортнага знаходжання на такіх пляцоўках усе ўмовы створаны. Аднак занепакоенасць выклікае тое, што чэргі сталі ўжо больш чым на тыдзень.

«Ужо і на пляцоўках не змяшчаюцца», — заўважыў Прэзідэнт.

«І самае галоўнае — толькі чалавеку чакаць проста ў машыне немагчыма, — дадаў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта. — Таму мы такую тэхналогію сёлета адпрацавалі: мы рэгіструем у электроннай чарзе і адпраўляем такія аўтамабілі, каб яны маглі чакаць перасячэння граніцы там, дзе ім больш зручна. А ўжо непасрэдна апавяшчаем літаральна перад перасячэннем граніцы за некаторы час, каб прыехаць камфортна перасекчы граніцу. Вось што мы зрабілі для людзей. І гэта працуе».

**Вераніка КАНЮТА.**

# «Я БЯЗМЕРНА ПАВАЖАЮ І ЛЮБЛЮ СВАІХ ЛЮДЗЕЙ, СВАЮ КРАІНУ»

**Падрабязнасці інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі расійскаму часопісу «Разведчик»**

Падчас інтэрв'ю закраналася шырокае кола тэм. Пытанні датычыліся як беларускага, так і саюзнага парадку дня. Безумоўна, цікавіўся расійскі журналіст і поглядам беларускага лідара на сусветныя працэсы — меркаванне вопытнага палітыка ніколі не разыходзіцца з рэчаіснасцю. Гэта праверана часам.

### «ЯК БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ, ТАК І БУДЗЕМ ЖЫЦЬ. ГАЛОЎНАЕ, КАБ У МІРЫ І ЗГОДЗЕ»

? ***Першае пытанне, адрасаванае Прэзідэнту, датычылася яго каласальнага вопыту дзяржаўнага кіравання, набытага ў надзвычай складаную гістарычную эпоху, і ўмення ўвесь гэты перыяд паспяхова весці краіну па «беларускім шляху», як Аляксандр Лукашэнка назваў яго ў сваёй інаўгурацыйнай прамове. Кіраўніка дзяржавы спыталі пра сакрэт поспеху і найбольш каштоўныя ўрокі дзяржаўнага будаўніцтва.***

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым згадаў сказаную ім некалі фразу «прэзідэнтамі не становяцца — прэзідэнтамі нараджаюцца» і патлумачыў, які сэнс укладваў у гэтыя словы. «Гэта не пра вышэйшыя сілы і прадбачанне, — удакладніў ён. — Я рэаліст і прагматык. Размова пра тое, як у чалавеку па меры сталення, паступова «ад жыцця, ад зямлі» зараджаецца ўсвядомленая любоў да краіны, свайго народа, гатоўнасць у цяжкі для дзяржавы момант узяць на сябе адказнасць і зрабіць усё, каб апраўдаць давер суайчыннікаў. Гэта пра ўстанаўленне асаблівай сувязі са сваім народам. Пра адказнасць за прынятыя палітычныя рашэнні і найцяжэйшую работу — без аглядкі на ўсё».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што бязмерна паважае і любіць сваіх людзей, сваю краіну. «І для мяне самае страшнае — падвесці народ, які ў мяне паверыў, — заўважыў ён. — 30 гадоў таму я пакляўся, што буду яму служыць сумленна. Гэта і раблю. Працую, а не ўладару. Як бы ні было складана».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што самыя лёсавызначальныя для краіны рашэнні ў Беларусі прымаюць з улікам меркавання людзей і іх інтарэсаў, праз рэферэндумы. «Я прывык ва ўсім спадзявацца і абапірацца на народ, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І глыбока перакананы, што толькі ён мае права вырашаць свой лёс. У гэтым сутнасць старажытнай славянскай традыцыі нашага народаўладдзя з часоў веча».

Галоўная ідэя, з якой Аляксандр Лукашэнка, паводле яго слоў, некалі прыйшоў у вялікую палітыку, — захаваць пераемнасць. «Быў ўнутраная ўпэўненасць у правільнасці гэтага курса і запыт грамадства, таму была падтрымка, — адзначыў ён. — Народ разумеў: у нас ёсць свая дзяржава, і, калі яе па-здрадніцку загубім, давядзецца пачынаць спачатку. Такая вось жыццёвая формула поспеху: хочаш расці, рухацца наперад — улічвай волю народа і не ламай выбудаваную папярэднімі пакаленнямі апору. Мы ведаем, як жылі нашы продкі, калі падпарадкоўваліся законам і інтарэсам іншых дзяржаў. Ведаем, як пачало мяняцца жыццё беларусаў у савецкі перыяд. Таму ў 90-я нават размовы быць не магло аб тым, каб патэнцыял, створаны ў БССР, аддаць замежным таўстасумам-алігархам. Ні за якія грошы. Людзі не зразумелі б і не дазволілі б гэта зрабіць».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што заўсёды імкнуўся зрабіць так, каб беларусы былі шчаслівыя на роднай зямлі, каб самі кіравалі ўласным лёсам і краінай. «І няхай мы сёння жывём небагата, але годна, — падкрэсліў ён. — Мы жывём на сваёй зямлі, ведаем, як жыць і што рабіць, выходзячы з рэсурсаў, якія маем. Галоўнае, мы жывём у мірнай, спакойнай і бяспечнай краіне. Паверце, калі не будзе міру, калі ў краіне пачнуць страляць і ўзрываць, — ужо нічога не трэба: ні работы, ні заробку... Вось чаму я не стамляюся паўтараць: лепш ваяваць у полі, на заводзе і ферме, чым у акопах».

Менавіта таму, як перакананы кіраўнік дзяржавы, беларусам нельга расслабляцца і самазаспакойвацца. Калі працаваць і захоўваць адзінства, можна дасягнуць шмат чаго. «Як будзем працаваць, так будзем і жыць, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Галоўнае, каб у міры і згодзе. За гэты шлях мільёны нашых суайчыннікаў у мінулым аддалі жыцці. За гэты шлях беларусы аддалі свае галасы 30 гадоў таму і галасуюць сёння. Я верны яму і буду ісці па ім да канца, каб захаваць суверэнную і незалежную Беларусь».

### «МЫ ЗАЎСЁДЫ ПРАПАНОЎВАЛІ І ПРАПАНУЕМ ЖЫЦЬ ПА-ДОБРАСУСЕДСКУ»

? ***Кіраўніка дзяржавы спыталі, якой будзе рэакцыя Мінска ў тым выпадку, калі Польшча і краіны Балтыі ў размовах аб намеры замініраваць граніцы з Беларуссю пяройдуць ад слоў да справы.***

«Такія заявы — твар агульнай палітыкі Захаду адносна Беларусі і Расіі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І самае сумнае, што палітыка гэта не мяняецца».

Ён заявіў, што прайшло ўжо 80 гадоў пасля заканчэння Другой сусветнай вайны, а на Захадзе да гэтага часу лічаць пагрозай Беларусь, Расію і іх саюз.

«Пад гэту марку НАТА спешна ўзбройвае Еўропу, а Польшча і краіны Балтыі, каб дагадзіць сваім гаспадарам, выдумляюць нібыта «ахоўныя» меры, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Адна з іх — выхад з Атаўскай канвенцыі і мініраванне граніцы з Беларуссю. Усё гэта не што іншае, як чарговая спроба націснуць на Беларусь».

Прэзідэнт падкрэсліў, што недружалюбная палітыка Захаду адносна нашай краіны перарастае ў адкрыта агрэсіўную. «Пакуль асаблівых рызык і прамых ваенных пагроз не бачым, паколькі супрацьпяхотныя міны — абарончы тып зброі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Тым больш што ў нас няма планаў пераходзіць граніцы суседзяў без запрашэння».

Аляксандр Лукашэнка чарговы раз заявіў аб гатоўнасці Беларусі сябраваць і супрацоўнічаць з усімі, хто гэтага шчыра хоча, ісці туды, дзе нас чакаюць. Але ісці «не на танках, а на трактарах».

У той жа час дзеянні суседзяў на заходніх межах наўрад ці садзейнічаюць бяспецы і стабільнасці ў рэгіёне. «Ну навошта сёння мініраваць граніцы, траціць мільёны на выбудоўванне жалезных агароджаў, на пераадоленне якіх мігрантам патрэбны лічаныя хвіліны? — рытарычна спытаў Прэзідэнт. — Мільёны долараў уклалі, раскралі палову, мініруюць граніцы, напампоўваюць арміі войскамі і тэхнікай, а што ў выніку? Каму ад гэтага лепш?»

Такое вар'яцтва, па словах кіраўніка дзяржавы, у першую чаргу небяспечнае для саміх жа ініцыятараў. «На шчасце, простыя людзі ўсё разумеюць і выступаюць супраць гэтых небяспечных авантур (напрыклад, 54 % палякаў у адным з апытанняў. — **«Зв.»**), — заўважыў беларускі лідар. — Ён звярнуў увагу, што санкцыі, уведзеныя супраць Расіі і Беларусі, негатыўна адбіліся і на жыцці палякаў, літоўцаў,

*(Заканчэнне на 4–5-й стар.)*

# «Я БЯЗМЕРНА ПАВАЖАЮ І ЛЮБЛЮ




латвійцаў, якія сутыкнуліся з ростам цэн на энерганосьбіты, стратай традыцыйных рынкаў, зніжэннем паступленняў у бюджэт. «Час паказаў, што санкцыі — стрэл сабе ж у нагу», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

«Аднак у кіраўніцтве Польшчы, Літвы і Латвіі палітычныя амбіцыі важнейшыя за разумны сэнс, — заявіў Прэзідэнт. — Бюджэт на абаронныя расходы ў гэтых краінах ужо набліжаецца да 5 % ВУП (для параўнання: у Беларусі — не больш як 1 %). За ўсё плацяць простыя людзі, сацыяльнае самаадчуванне якіх з кожным днём толькі растае разам з надзеямі на лепшае жыццё. Але пра іх, як і пра наступствы шалёных рашэнняў, ніхто не думае».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі і ў Саюзнай дзяржаве, вядома, сочаць за развіццём абстаноўкі на заходніх рубяжах і ў выпадку прамой пагрозы імгненна адкажуць любому, хто замахнецца на беларускую зямлю. «Калі пярройдуць ад слоў да справы — мала не падасца, — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. — Для таго каб нанесці непрымальную шкоду агрэсару, у нас ёсць усё неабходнае. Правярацъ не раю. Аднак суседзяў не выбіраюць, яны ад Бога. І мы заўсёды прапаноўвалі і прапануем жыць па-добрасуседску. Не хочуць. Твораць на граніцы такое, што розуму недаступна».

## «МЫ ПАВІННЫ БУДАВАЦЬ МАСТЫ, А НЕ СЦЕНЫ»

? ***Кіраўніка дзяржавы спыталі, ці чакаюць у Беларусі якіх-небудзь змяненняў у адносінах з Польшчай у сувязі з уступленнем на пасаду новага Прэзідэнта гэтай краіны Караля Наўроцкага.***

«Скажу шчыра: мы не маем ілюзій адносна хуткага аднаўлення дыялогу, — сказаў беларускі лідар. — З аднаго боку, лозунгам пана Наўроцкага на выбарах быў «Польшча перш за ўсё». У сваіх перадвыбарных выступленнях ён неаднаразова заяўляў, што абарона польскага народа — адна з мэт яго прэзідэнцтва. Мы разумеем, што на гэтай тэме падчас перадвыбарнай гонкі было зручна набіраць ачкі. Але мы ведаем, што польскі народ хоча развіваць адносіны з нашай краінай. Палякі і беларусы не ворагі адзін аднаму. З іншага боку, Варшава працягвае прад'яўляць неабгрунтаваныя прэтэнзіі і абвінавачванні ў адрас Беларусі. Яна ж прытуліла, палітычна і інфармацыйна падсілкоўвае нашых збеглых, выкарыстоўваючы іх у сваіх мэтах».

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на спробы перапісаць, перайграць гісторыю, падагнаць яе тлумачэнне пад палітычную кан'юнктуру. «Мы таксама добра ведаем, якую ролю адыграў цяперашні прэзідэнт Польшчы (у яго бытнасць кіраўніком польскага Інстытута нацыянальнай памяці) у дэмантажы помнікаў савецкім воінам, якія загінулі пры вызваленні Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — заўважыў Прэзідэнт. — Толькі ўдумайцеся: 600 тысяч савецкіх воінаў, сярод якіх нямала беларусаў, загінулі ў баях за Польшчу і назаўжды засталіся ляжаць у польскай зямлі! І хто з тамтэйшых палітыкаў сёння аб гэтым успамінае? Чым нам сёння адказваюць? Пагрозамі, санкцыямі, мілітарызацыяй, «байполамі», «байсоламі» (антыдзяржаўныя арганізацыі, якія фінансуюцца Захадам. — **«Зв.»**) і іншымі дыверсіямі».

Да таго ж вядома, што Караль Наўроцкі з'яўляецца перакананым прыхільнікам НАТА і саюза з ЗША і наўрад ці адступіць ад сваіх перакананняў. «Таму не даводзіцца чакаць, што будзе, як раней, але мы ўсё ж спадзяёмся, што ў польскіх калег возьмуць верх палітычныя мудрасць і разважнасць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Спадзяёмся, што па той бок граніцы нас пачуюць, будуць аб'ектыўна ацэньваць сітуацыю ў Беларусі і перастануць умешвацца ў нашы ўнутраныя справы. Мы адкрытыя для дыялогу. У сучасных умовах важна знаходзіць шляхі для вырашэння праблем, а не ствараць новыя. Мы павінны будаваць масты, а не сцены, чаго не скажаш аб суседзях».

## «МІРНЫМ ПЕРАГАВОРАМ ПА УКРАІНЕ НЯМА АЛЬТЭРНАТЫВЫ»

? ***Асобным блокам падчас інтэрв'ю прагучала тэма ўстанаўлення міру ва Украіне.***

«Мірным перагаворам па Украіне няма альтэрнатывы, — падкрэсліў беларускі лідар. — Але гэта павінен быць адкрыты і паважлівы дыялог, які дасць магчымасць знайсці кампраміс з улікам інтарэсаў усіх бакоў канфлікту».

Па яго словах, цяпер застаецца верыць, што Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп сапраўды хоча пакласці канец гэтаму канфлікту. «На Алясцы (у час перагавораў з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. — **«Зв.»**), што б там ні пісала еўрапейская і часткова амерыканская прэса, Трамп са сваёй роляй, — а ён адыгрываў выключна ролю пасрэдніка, які хацеў даведацца з першых вуснаў пазіцыю Расіі як боку канфлікту, — я лічу, справіўся», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што непасрэдна перад перагаворамі на Алясцы адбылася іх тэлефонная размова з Прэзідэнтам ЗША — адкрытая, добрая размова. «Гаварылі і аб Украіне, — удакладніў беларускі лідар. — Я выклаў Трампу сваё бачанне, свой пункт гледжання. Ён яго выслухаў. Ну, а наколькі наша размова была карысный перад сустрэчай на Алясцы, — гэта ўжо яму лепш відаць».

Кажучы аб манеры Дональда Трампа весці перагаворы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Прэзідэнт ЗША гаворыць жорстка, без дыпламатычнага шалупіння. «З ім можна не згаджацца, спрачацца, але ты разумееш яго пазіцыю, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — І гэта больш каштоўна, чым дзясяткі еўрапейскіх дэкларацый, дзе кожнае слова загорнутае ў прыгожую дыпламатычную абгортку, аднак пры гэтым нічога не значыць».

## «НОВЫЯ ЦЭНТРЫ СІЛЫ НАБІРАЮЦЬ ПАЛІТЫЧНУЮ ВАГУ. З ІМІ ДАВЯДЗЕЦЦА ЛІЧЫЦЦА»

? ***У беларускага лідара спыталі, як ён успрыняў запозненыя прызнанні еўрапейскіх удзельнікаў мінскіх перагавораў 2015 года аб тым, што яны і не збіраліся выконваць дасягнутыя пагадненні, а толькі «куплялі час» для кіеўскага рэжыму. У кіраўніка дзяржавы ўдакладнілі, якім можа быць дыялог з падобнымі «партнёрамі» ў далейшым?***

«Было нечакана, але нядзіўна, — адказаў Прэзідэнт. — Нечакана, бо ад палітыкаў такога ўзроўню (а яны сябе прылічвалі да пантэона сусветных лідараў, так жа?) усё ж чакаеш нейкай паслядоўнасці, сур'ёзнасці, грунтоўнасці. З іншага боку, прызнанне еўралідараў у тым, што яны выйшлі на перагаворную пляцоўку, прабачце за выказванне, з фігай у кішэні, было нядзіўным. Нічога новага. Яны прывыклі хлусіць, гэта іх стыль».

Ён адзначыў, што ў 2015 годзе беларусы рыхтавалі перагаворы ў Мінску шчыра. «Мы стараліся думаць аб Захадзе як аб адказным партнёры, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Інакш у чым сэнс выхаду на перагаворную пляцоўку такога ўзроўню? Так, мы разлічвалі, што падпісаныя ў Мінску дамоўленасці закладуць трывалую аснову для доўгачасовай стабілізацыі. Усе працавалі па-сапраўднаму. Сямнаццаць гадзін найцяжэйшых перагавораў, без сну, з эмацыянальнымі спрэчкамі, але з жаданнем спыніць кровапраліцце, аднавіць мір».

А ў гэты ж час Ангела Меркель і Франсуа Аланд, якія на той момант прадстаўлялі Германію і Францыю, па іх жа прызнаннях, прыехалі ўсыпіць пільнасць другога боку перагавораў, назапасіць сіл і падкінуць дроў ва ўкраінскае вогнішча.

Таму, на думку Аляксандра Лукашэнкі, заканамерным і лагічным выглядае цяперашняе нежаданне Прэзідэнта ЗША Дональда Трампа далучаць да перагавораў еўрапейцаў. «Навошта яму мець адносіны з палітыкамі, рэпутацыя якіх ніжэйшая за плінтус, — заўважыў беларускі лідар. — Яму патрэбны і партнёры, і апаненты, з якімі ён будзе размаўляць на роўных. А на роўных — гэта ўжо з іншымі лідарамі. Гэта краіны ШАС, БРІКС. Фарміруецца сур'ёзная процівага старым структурам. І гэты махавік не спыніць — новыя цэнтры сілы набіраюць палітычную вагу. З імі давядзецца лічыцца».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на глабальную ініцыятыву, выказаную Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам на саміце ШАС у Кітаі, — кіраванне на аснове раўнапраўя і справядлівасці. «Сі прапануе: суверэнная роўнасць, першынства міжнароднага права, шматбаковасць. І гэта менавіта тое, што трэба, каб разблытаць клубок праблем, што назапасіліся ў міжнародным парадку дня», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, гэта дазволіць аднавіць давер, страчаны з-за авантур Еўрасаюза. А пры тых уводных, якія ёсць па выніку прызнанняў яго лідараў, такога даверу да краін ЕС няма. «Я не ведаю, як можна весці з імі справы ў прынцыпе», — дадаў беларускі лідар.

## «НАША ВІЗІТНАЯ КАРТКА НА ГЛАБАЛЬНАЙ АРЭНЕ — ГРУНТОЎНАСЦЬ І НЯЎХІЛЬНАЯ РЭАЛІЗАЦЫЯ ДАСЯГНУТЫХ ДАМОЎЛЕНАСЦЯЎ»

? ***У Прэзідэнта спыталі пра прыярытэты Беларусі ў наладжванні сувязяў з краінамі Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. У кіраўніка дзяржавы ўдакладнілі, якое значэнне для Мінска мае членства ў ШАС, партнёрства ў БРІКС, у чым галоўныя канкурэнтныя перавагі беларускай знешняй палітыкі.***

Гаворачы ў цэлым аб знешняй палітыцы Беларусі і аб яе канкурэнтных перавагах, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што краіна з моманту набыцця незалежнасці сістэмна і мэтанакіравана выбудоўвала дружалюбныя адносіны з замежнымі партнёрамі. У аснове гэтага працэсу — прынцып шматвектарнасці.

«Краіны далёкай дугі, дзверы якіх адчынены для нас, — гэта ўжо не проста «пояс» эканамічнага росту, а прастора раўнапраўных партнёраў, дзе перасякаюцца інтарэсы вядучых сусветных дзяржаў, фарміруюцца новыя альянсы і цэнтры сілы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Увага ўсіх без выключэння прыкавана сёння да Азіі, Афрыкі і Блізкага Усходу».

У Азіі Беларусь актыўна развівае дыялог з Кітаем, Іранам, В'етнамам, Інданезіяй, Пакістанам, КНДР, Індыяй, Тайландам, Лаосам, Камбоджай, Малайзіяй, М'янмай, Філіпінамі і іншымі краінамі. На Блізкім Усходзе актыўна ўзаемадзейнічае з Аманам, ААЭ, Саудаўскай Аравіяй, Катарам, прытрымліваючыся тактыкі навядзення мастоў, калі пэўныя краіны становяцца праваднікамі Беларусі ў іншыя рэгіёны.

Немалыя вынікі дасягнуты Беларуссю ў Афрыцы. Летась экспарт туды істотна вырас і склаў больш за паўмільярда долараў. «Паспяхова рэалізуюцца сумесныя праграмы механізацыі сельскай гаспадаркі з Зімбабвэ і Нігерыяй, — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы. — Гэты элемент супрацоўніцтва стаў брэндам Беларусі ў Афрыцы і выклікае значную цікавасць у іншых краін кантынента — ад Гвінеі-Бісау да Мазамбіка. Умацоўваюцца сувязі з традыцыйнымі партнёрамі: Егіптам, Кеніяй, ПАР, Эфіопіяй. Новы імпульс атрымалі кантакты з Алжырам. Мы верныя сваім падыходам — прыходзім у Афрыку як сябры, каб дапамагчы і навучыць там, дзе ў гэтым ёсць патрэба».

Што датычыцца Лацінскай Амерыкі, тут Беларусь нацэлена на ўсебаковае ўмацаванне міждзяржаўнага дыялогу з асноўнымі саюзнікамі ў рэгіёне — Венесуэлай, Кубай і Нікарагуа. Дзякуючы планамернаму і паступальнаму выбудоўванню супрацоўніцтва з Аргенцінай, Бразіліяй, Калумбіяй, Панамай, Уругваем і Эквадорам, відаць практычная аддача і гатоўнасць гэтых краін да прагматычнага ўзаемадзеяння.

# СВАІХ ЛЮДЗЕЙ, СВАЮ КРАІНУ»

Акрамя развіцця двухбаковых кантактаў Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на ўзаемадзеянне з міжнароднымі арганізацыямі. Ён нагадаў, што Беларусь стала паўнапраўным удзельнікам адной з найбуйнейшых уплывовых рэгіянальных структур — Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Наша краіна набыла статус партнёра БРІКС — аб'яднання, якое, па сутнасці, з'яўляецца голасам глабальнай большасці.

«Наш стратэгічны ўнёсак у стабільнасць і развіццё Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі — забеспячэнне харчовай бяспекі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы можам прапанаваць і, што самае галоўнае, рэалізаваць комплексныя інтэграваныя рашэнні — ад паставак сельгастэхнікі і трансферу тэхналогій да арганізацыі перапрацоўкі, захоўвання, сэрвіснага абслугоўвання, лагістыкі. Наша візітная картка на глабальнай арэне — грунтоўнасць і няўхільная рэалізацыя дасягнутых дамоўленасцяў, уменне вырашаць маштабныя задачы аптымальнымі сіламі».

## «ВЫБАР НА КАРЫСЦЬ САЮЗА З РАСІЯЙ ПРАДЫКТАВАНЫ САМІМ ЖЫЦЦЁМ»

***?** Важнай тэмай інтэрв'ю стала развіццё Саюзнай дзяржавы. Прэзідэнта папрасілі ацаніць дасягнутыя за апошні час вынікі і перспектывы на будучыню.*

«Азіраючыся на пройдзены шлях, з упэўненасцю магу сказаць: выбар на карысць саюза з Расіяй прадыктаваны самім жыццём, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэты выбар выратаваў нашы краіны ад эканамічнай катастрофы і страты суверэнітэту». Асабліва востра, паводле яго слоў, гэта выявілася пасля крызісу 1998 года, калі прадпрыемствы спыняліся, цэны раслі, людзі гублялі зберажэнні. Менавіта тады стала канчаткова зразумела — альбо краіны разам знаходзяць рашэнне, альбо кожная будзе выжываць паасобку.

«І мы знайшлі гэты шлях — праз рэальную эканамічную інтэграцыю, стварэнне сумесных вытворчасцяў, узгодненую сацыяльную палітыку», — канстатаваў Прэзідэнт.

Вядома, не ўсё атрымлівалася адразу. «Мы прайшлі праз мноства выпрабаванняў: фінансавыя крызісы, глабальныя эканамічныя ўзрушэнні, шалёныя санкцыі Захаду, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Разам мы вытрымалі сур'ёзную праверку на трываласць. Вытрымалі таму, што стварылі ўнікальны фармат інтэграцыі, які не мае аналагаў у свеце. Пры гэтым кожная краіна захоўвае свой суверэнітэт, незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць, дзяржаўнае будаўніцтва. Моцныя суверэнныя дзяржавы — моцны саюз. Вось формула поспеху любой інтэграцыі».

Прэзідэнт адзначыў, што рэсурсы ў Беларусі і Расіі розныя, але ў гэтым і сіла Саюзнай дзяржавы. «Мы не дублюем адна адну, а арганічна дапаўняем, закрываем прабелы і памнажаем перавагі», — дадаў ён.

Расія была і застаецца галоўным гандлёва-эканамічным партнёрам Беларусі. Па выніках 2024 года Беларусь увайшла ў чацвёрку краін свету па аб'ёме тавараабароту з Расіяй і прадаўжае лідзіраваць сярод краін СНД. Гандлёвы абарот паміж дзяржавамі вырас у сем разоў, дасягнуўшы летась разам з паслугамі амаль $60 млрд.

Па словах Прэзідэнта, аснова далейшага развіцця саюзніцкіх адносін дзвюх краін — паглыбленне рэгіянальнай інтэграцыі. У гэтым аспекце ён згадаў штогадовы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

«Узаемадзеянне ў навукова-тэхнічнай сферы прайшло сур'ёзную эвалюцыю ад падтрымкі асобных галін да стварэння прынцыпова новых кірункаў, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Асабліва ярка гэты прагрэс бачны ў касмічнай сферы. Толькі ўявіце: восем сумесных праграм, першая беларуская жанчына-касманаўт на арбіце, дзеючы сумесны спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі і новы апарат з рэкордным пашырэннем у 35 см, дзе начынне наша, а платформа — расійская».

Ідзе актыўная работа над стварэннем адзінай лічбавай прасторы, развіццём штучнага інтэлекту, украненнем разумных тэхналогій. «Сапраўдным тэхналагічным прарывам і сімвалам дружбы брацкіх народаў стала Беларуская АЭС, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта наш адказ на палітычны ціск і пляцоўка для развіцця ўласных кампетэнцый у выкарыстанні мірнага атама».

Без пабудовы аб'яднаных рынкаў энергарэсурсаў, па словах кіраўніка дзяржавы, складана разлічваць на эфектыўны рух наперад. «Падпісаны дагавор аб агульным рынку электраэнергіі — толькі пачатак, — дадаў ён. — Нам трэба рухацца далей: ствараць агульны рынак газу, устанаўліваць адзіныя правілы нафтавага рынку, забяспечваць справядлівыя цэны для перапрацоўшчыкаў, роўныя ўмовы гаспадарання для суб'ектаў абедзвюх краін. У гэтым і сутнасць нашай Саюзнай дзяржавы — не проста дапамагаць адно аднаму, а ствараць агульныя правілы гульні, якія вядуць да фарміравання паўнацэннай адзінай эканамічнай прасторы з захаваннем палітычнага суверэнітэту кожнай краіны. 25 гадоў таму мы заклалі для гэтага фундамент. Сёння ўзводзім будынак, а заўтра пабудуем цэлы горад на аснове тэхналагічнага суверэнітэту нашых эканомік. У ім абавязкова знойдзецца месца для новых сумесных праектаў, прарыўных тэхналогій і новых адкрыццяў».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным яны часта гавораць: саюз Беларусі і Расіі правераны часам. «Але сёння я скажу больш — ён правераны самім жыццём, — заявіў беларускі лідар. — І пакуль мы захоўваем вернасць агульным ідэалам, пакуль мы разам будуем агульную будучыню, нас не зламаць нікому. У гэтым сіла Саюзнай дзяржавы, залог нашай непераможнасці».

## «ТРЭБА АДЛЮСТРАВАЦЬ АБ'ЕКТЫЎНЫ ПОГЛЯД НА НАШУ ГІСТОРЫЮ»

***?** Адно з пытанняў датычылася будаўніцтва новага Нацыянальнага гістарычнага музея і парку Народнага адзінства ў Мінску.*

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што іх з'яўленне — гэта адказ на запыт часу. «Галоўная задумка — паказаць няпросты тысячагадовы шлях станаўлення беларускай дзяржаўнасці і афармлення беларусаў як самадастатковай нацыі з унікальнай гісторыяй і багатай культурай. Гэта права наш народ заслужыў спаўна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беларусы прайшлі складаны гістарычны шлях і дасягнулі высокіх вынікаў. «Не зламаліся, калі жылі пад бізуном паноў, не растварыліся ў чужым этнасе, калі гэтым жа бізуном з беларусаў выбівалі гістарычную памяць, веру, мову, культуру, — заўважыў ён. — Пабудавалі дзяржаву на небывалай разрусе пасля Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Праявілі масавы бяспрыкладны гераізм, абараняючы Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Уся гісторыя народа — подзвіг. Гэта павінна стаць аб'ектам гонару для людзей, асабліва для моладзі, якая актыўна ўключылася ў гэту агульнанацыянальную будоўлю»

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што галоўным яго патрабаваннем да аўтараў праекта было абысціся без усялякага нацыяналістычнага або ўра-патрыятычнага перахлёсту. «Трэба адлюстраваць аб'ектыўны погляд на нашу гісторыю, — лічыць ён. — Усё павінна быць заснавана на фактах і зроблена ў духу часу. У новым будынку музея нашчадкі ўбачаць узор адносін да свайго мінулага».

## «НЕЗАЛЕЖНАЯ КРАІНА НЕ МОЖА ІСНАВАЦЬ І РАЗВІВАЦЦА БЕЗ ДОБРА АСНАШЧАНАЙ І ПРАФЕСІЙНА АРГАНІЗАВАНАЙ АРМІІ»

***?** У інтэрв'ю прагучала тэма ваеннай службы. Кіраўнік дзяржавы, адказваючы на пытанне, падрабязна расказаў пра свой вопыт службы ў пагранвойсках.*

«Як і ўсе савецкія хлопцы, лічыў і лічу абарону Радзімы абавязкам сапраўднага мужчыны, — падкрэсліў ён. — Я часта кажу: які ж ты мужык, калі не служыў? Служыць у гады майго юнацтва было пачэсна. Салдат у той час выклікаў ва ўсіх шчырую павагу».

У Беларусі, паводле слоў Прэзідэнта, ваеннай службе вярнулі прэстыж, які быў амаль страчаны ў 1990-я гады, і цяпер хлопцы імкнуцца служыць.

«Ваенная служба загартавала мой характар, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Яе заўсёды ўспамінаю з цеплынёй. Я ўдзячны камандзірам, якія мяне шмат чаму навучылі. Часта думаю, што, калі б не трапіў у пагранвойскі, не быў бы тым, хто я ёсць сёння».

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што як адзіны сын у маці і педагог па адукацыі ў тыя гады не падлягаў прызыву. Але ўсё ж прыняў рашэнне служыць. «Збольшага натхніўся прыкладам стрыечных братоў і выбраў пагранвойскі, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Я, вядома, рваўся туды, дзе складана. Хацелася выпрабаваць мяжу сваіх магчымасцяў, праявіць сябе, прынесці карысць Радзіме. Наша пакаленне было так выхавана».

Накіраванне на службу Аляксандр Лукашэнка атрымаў у Брэсцкі памежны атрад — найлепшы ў Савецкім Саюзе. І адпаведна гэтаму статусу трэба было кругласутачна. «Трэніравалі нас моцна, — расказаў ён пра той перыяд. — На граніцы абстаноўка заўсёды была напружаная, патрабуе пастаяннай баявой гатоўнасці. А ў такіх умовах могуць служыць толькі фізічна моцныя, маральна ўстойлівыя і адказныя людзі».

Даслужыўся Аляксандр Лукашэнка да інструктара палітаддзела воінскай часці Заходняй пагранічнай акругі. «Мне падабалася працаваць з асабовым саставам, — удакладніў ён. — Пасля работы ў камсамольскіх органах і лектарам у таварыстве «Веды» вырашыў прадоўжыць службу афіцэрам у 120-й Рагачоўскай дывізіі імя Вярхоўнага Савета БССР. Пасада намесніка камандзіра роты патрабавала ўмення настроіць салдат на асваенне ваеннай справы, выхаваць у кожным характар воіна, сапраўднага абаронцы».

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ён ганарыцца тым, што давялося паўдзельнічаць у вучэннях «Захад-1981»: «Сур'ёзныя вучэнні. Калі натаўцы іх убачылі, зразумелі, што з намі жарты дрэнныя».

Праз ваенную службу Аляксандр Лукашэнка спазнаў простую ісціну: незалежная краіна, якая сябе паважае, не можа існаваць і развівацца без добра аснашчанай і прафесійна арганізаванай арміі. «Сёння гэты вопыт дапамагае мне як Галоўнакамандуючаму эфектыўна выбудоўваць і ўмацоўваць сістэму нацыянальнай бяспекі краіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## «ФІЗІЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ — НЕ ПРОСТА ХОБІ, ГЭТА ЛАД ЖЫЦЦЯ»

***?** У Прэзідэнта пацікавіліся яго адносінамі да фізкультуры і спорту. Таксама кіраўнік дзяржавы расказаў аб развіцці гэтых кірункаў у краіне.*

«Для Беларусі спорт — не проста спаборніцтвы і медалі, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Гэта адзін з краевугольных камянёў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, інструмент развіцця міжнародных сувязяў і пляцоўка для народнай дыпламатыі. А самае галоўнае — здароўе нацыі».

Паводле яго слоў, санкцыі міжнародных спартыўных органаў паставілі беларускіх атлетаў і трэнераў у няпростыя ўмовы. «Аднак, насуперак націску, мы не толькі захавалі, але і ўмацавалі спартыўны патэнцыял краіны», — канстатаваў Прэзідэнт, адзначыўшы ў сувязі з гэтым асаблівую ролю супрацоўніцтва з Расіяй. Так, за апошнія тры гады праведзена больш як 1,7 тысячы сумесных спаборніцтваў і вучэбна-трэніровачных збораў.

У найбольш уразлівым становішчы аказаліся камандныя гульнявыя віды спорту, якія пазбавіліся звыклага міжнароднага календара. Але і тут была наладжана сістэмная работа, у тым ліку за кошт удзелу ў розных лігах, створаных расіянамі.

«Мы актыўна развіваем спартыўныя сувязі з іншымі сяброўскімі краінамі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Вынікі выступлення беларускіх спартсменаў на такіх прэстыжных спаборніцтвах, як Гульні краін БРІКС, «Дзеці Азіі» і «Гульні будучыні», дэманструюць наш высокі патэнцыял і прыхільнасць Беларусі да асноватворных алімпійскіх прынцыпаў. Наша краіна не толькі ўдзельнічае ў міжнародных стартах, а і сама выступае арганізатарам буйных спартыўных мерапрыемстваў. Мы не закрываемся ад сусветнай супольнасці і гасцінна прымаем у сябе атлетаў з іншых краін». Напрыклад, замежныя ўдзельнікі традыцыйна праяўляюць цікавасць да турніраў па барацьбе, мастацкай гімнастыцы, боксе і іншых відах спорту, якія штогод праводзяцца ў Беларусі.

Што да асабістых адносін Аляксандра Лукашэнкі да спорту, то гэта ўсім добра вядома. Спорт заўсёды займаў і прадаўжае займаць важнае месца ў жыцці кіраўніка дзяржавы. «Фізічная актыўнасць — не проста хобі, гэта лад жыцця, які я прапагандую і якога прытрымліваюся сам, — падкрэсліў ён. — Па магчымасці, вядома, але стараюся не радзей як два разы на тыдзень выходзіць на лёд, трэніравацца. Я б вельмі хацеў, каб наша моладзь таксама аддавалася выбранай справе, імкнулася быць моцнай і паспяховай».

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# СЕСІЯ ПАЧЫНАЕЦЦА. ЗАКОНАПРАЕКТЫ ЎНЕСЕНЫ

## Сёння адкрываюцца чацвёртая сесія Савета Рэспублікі і трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання



Фота БелТА.

У адпаведнасці з часткай першай артыкула 95 абнуленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, палаты Парламента збіраюцца на сесію, якая адкрываецца ў трэці аўторак верасня і закрываецца ў апошні працоўны дзень чэрвеня наступнага года.

Да трэцяй сесіі ў Палату прадстаўнікоў ужо ўнесены 24 законапраекты. Аб гэтым паведаміў журналістам **намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Вадзім ІПАТАЎ** на пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў.

«14 праектаў рыхтуюцца да разгляду ў першым чытанні, тры праекты — да другога чытання і сем праектаў — да разгляду ў першым чытанні, але яны ў першую чаргу звязаныя з міжнародным супрацоўніцтвам. Пытанні самыя розныя — ад крымінальнай адказнасці да водакарыстання. Гэта значыць, тыя, якія найпрост звязаныя з жыццём людзей», — сказаў ён.

Найважнейшая задача дэпутатаў — якасная падрыхтоўка законапраектаў, як таго патрабуе Прэзідэнт, каб яны прайшлі праз жыццё. «Тут мы выкарыстоўваем самыя розныя метады работы, пачынаючы з арганізацыі вывучэння пытанняў дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў на арганізаваных семінарскіх пасяджэннях, круглых сталах і заканчваючы пашыранымі пасяджэннямі пастаянных камісій. Яшчэ адзін важны момант: мы аднавілі практыку, якая існавала раней, — прадстаўленне Міністэрствам замежных спраў інфармацыі пра найбольш значныя, важныя законапраекты, прынятыя ў розных дзяржавах. Гэта ў першую чаргу накіравана на тое, каб, працуючы над падобнымі пытаннямі, мы маглі забяспечыць належны ўзровень прагназавання наступстваў прыняцця праекта, а таксама, вядома, прапрацоўку найбольш эфектыўных пытанняў прававога рэгулявання», — адзначыў Вадзім Іпатаў.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА** нагадаў, што ў беларускім заканадаўстве няма такога паняцця, як «парламенцкія канікулы». «Палата прадстаўнікоў працуе бесперапынна. У міжсесійны перыяд дзейнасць дэпутатаў па падрыхтоўцы законапраектаў асабліва актывізуецца. Гэта дазволіла нам да пачатку сесіі падысці з самавітым партфелем законапраектаў — узгодненых, дапрацаваных і гатовых да разгляду ў Авальнай зале. Усяго будзе разгледжана 19 законапраектаў. Сярод іх я б вылучыў Водны, Падатковы кодэксы, КаАП. Таксама ёсць законапраекты, якія датычацца ваеннай бяспекі, абароны, дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях. Асобным блокам стаяць законапраекты, якія датычацца непасрэдна забеспячэння жыццядзейнасці нашых грамадзян. Гэта, напрыклад, законы па пытаннях пітнога водазабеспячэння, дарожнай дзейнасці, энергазберажэння. Усе гэтыя законапраекты будуць разгледжаны ў першым чытанні», — падкрэсліў ён.

Асобным вялікім блокам, які складае прыкладна трэць усіх пытанняў, што будуць разглядаць дэпутаты, стаяць законапраекты, якія датычацца сертыфікацыі міжнародных дагавораў і пагадненняў, расказаў Валянцін Семяняка. «Тут неабходна вылучыць два законапраекты, якія датычацца ўзаемаадносін з Расійскай Федэрацыяй. У прыватнасці, будзе ратыфікавана пагадненне аб прадастаўленні аднолькавых выбарчых правоў грамадзянам Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Гэта практыка ўжо існуе, яе проста трэба канчаткова дапрацаваць юрыдычна. Таксама будзе разгледжаны і прыняты законапраект, які ратыфікуе пагадненне аб абароне грамадзян Саюзнай дзяржавы ад незаконнага праследу замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. У гэтым жа блоку міжнароднага супрацоўніцтва — шэраг пагадненняў з дзяржавамі далёкай дугі па прадастаўленні асобным катэгорыям грамадзян бязвізавага рэжыму. Яны будуць датычыцца грамадзян як Рэспублікі Беларусь, так і гэтых дзяржаў», — звярнуў увагу старшыня пастаяннай камісіі.

Разам з гэтым чакаецца ўнясенне новых законапраектаў. «Пералік, які мы зацвердзім і які стане асноўным дакументам для нашай першачарговай дзейнасці, не канчатковы. Па меры падрыхтоўкі законапраектаў, па меры іх паступлення ў Палату прадстаўнікоў і гатоўнасці парадак дня сесіі будзе дапаўняцца, — заўважыў Валянцін Семяняка. — Думаю, ён будзе насычаным, і самае галоўнае, што той план заканатворчай дзейнасці, што ў нас ёсць з гэтага года, будзе выкананы і нават перавыкананы з улікам рэальных абставін жыцця, з якімі мы сутыкаемся кожны дзень».

**Паводле БелТА.**

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# ПАЛІТЫКА АДКРЫТАСЦІ І ТРАНСПАРЭНТНАСЦІ

## Больш за 150 журналістаў з 15 краін сочаць за падзеямі стратэгічнага вучэння «Захад-2025»

У краіне працягваецца сумеснае стратэгічнае вучэнне Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2025». У панядзелак на 227-м агульнавайсковым палігоне «Барысаўскі» прайшоў адзін з асноўных этапаў розыгрышу практычных манеўраў войскаў. За іх дзеяннямі назіралі прадстаўнікі 23 дзяржаў, у тым ліку трох краін — членаў НАТА: ЗША, Турцыі і Венгрыі, трох міжнародных аб'яднанняў: Саюзнай дзяржавы, АДКБ і СНД, прадстаўнік Цэнтра па прадухіленні канфліктаў АБСЕ і больш за 150 журналістаў з 15 краін.

На адным з самых буйных палігонаў Узброеных Сіл, дзе на працягу навучальнага года праводзіцца значная колькасць мерапрыемстваў баявой падрыхтоўкі, ваеннаслужачыя адпрацоўвалі шэраг тактычных эпізодаў.

«Мы знаходзімся на завяршальнай стадыі правядзення сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2025», якое з'яўляецца асновай падрыхтоўкі войскаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, — расказаў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**. — Гэтаму вучэнню папярэднічала вялікая работа ў рамках планавання, падрыхтоўкі органаў кіравання войскаў, аб'ектаў вучэбнай матэрыяльнай базы, пытанняў забеспячэння. Як мы і заяўлялі раней, вучэнне гэта планавае, у два этапы». Першы этап завершаны. Падчас яго былі адпрацаваны кіраванне войскамі падчас адбіцця агрэсіі, а таксама такое важнае пытанне, як арганізацыя ўзаемадзеяння: «Цяпер праходзіць другі этап вучэння, дзе адпрацоўваюцца пытанні аднаўлення тэрытарыяльнай цэласнасці. Вучэнне праходзіць на трох палігонах, у некалькіх раёнах мясцовасці Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцей. Усе раёны правядзення вучэння знаходзяцца ўдалечыні ад дзяржаўных граніц».

Міністр абароны расказаў і пра новыя формы і спосабы тактычных дзеянняў войскаў, адпрацаваных падчас вучэнняў «Захад-2025»: «Новае ўсё, асабліва формы і спосабы тактычных дзеянняў войскаў. У нас ёсць добрая магчымасць, акрамя як самім аналізаваць, яшчэ і атрымліваць вопыт ад нашых расійскіх калег, якім яны актыўна дзеляцца. Калі ўзяць узровень вышэй, аператыўны, стратэгічны, скажу так: нам удалося ў сістэму правядзення дадзенага вучэння спланаваць пытанні прымянення зброі больш магутнага паражэння. Мы ўпершыню змаглі сістэматызаваць і адпрацаваць пытанні прымянення і процідзеяння беспілотным лятальным апаратам.

Неабходна яшчэ адпрацаваць шэраг пытанняў, задач, затым войскі вернуцца ў пункты пастаяннай дыслакацыі, і, вядома ж, трэба будзе правесці дэталёвы аналіз.





«Як міністр, магу з упэўненасцю сказаць: я бачу зладжаную і выразную работу органаў кіравання і войскаў. Мы прытрымліваемся простага прынцыпу: мы не думаем, што вораг да нас не прыйдзе, — мы думаем пра тое, з чым і як яго сустрэнем. Вось гэтаму вучым свае войскі, — падкрэсліў міністр абароны. — Такую адкрытасць, якую мы праяўляем і забяспечваем на дадзеным вучэнні, цяжка ўявіць. Галоўная прычына — нам няма чаго хаваць. Па-другое, мы зацікаўлены ў зніжэнні напружанасці ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне і для гэтага робім рэальныя практычныя крокі. Мабыць, самы галоўны крок, які быў зроблены, — гэта прынятае нашым Прэзідэнтам рашэнне аб адводзе асноўных дзеянняў войскаў углыб нашай краіны, што мы і зрабілі».

Віктар Хрэнін нагадаў, што рашэнне аб правядзенні такога вучэння было прынята ў 2009 годзе кіраўнікамі дзяржаў — Беларусі і Расіі — 16 гадоў таму. «З гэтага моманту кожныя два гады мы праводзім вучэнне альбо на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, альбо на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Дарэчы, на нашай тэрыторыі гэта ўжо пятае вучэнне, — заўважыў ён. — Кожнае вучэнне, падрыхтоўка, асабліва правядзенне мерапрыемстваў, падвяргаецца мэтанакіраванай інфармацыйнай атацы. Чаго мы толькі не наслухаліся ад розных палітыкаў, экспертаў рознага ўзроўню: што мы пагражаем НАТА, што мы цяпер будзем захопліваць краіны Прыбалтыкі... Мы спакойна глядзім на гэтыя інфармацыйныя атакі, бо, як я сказаў, нам няма чаго хаваць, мы рыхтуемся да абароны сваёй краіны».

Вучэнне, на думку беларускага боку, з'яўляецца беспрэцэдэнтна адкрытым, мы не нясём нікому пагрозы, мы за выбудоўванне канструктыўнага і прагматычнага дыялогу, расказаў журналістам **начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочнік міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва генерал-маёр Валерый РАВЕНКА**: «На жаль, у тым ліку кіраўніцтвам Польшчы было заяўлена аб агрэсіўнасці гэтых мерапрыемстваў, хоць мы паведамлялі аб колькасці войскаў, іх ненакіраванасці супраць заходніх дзяржаў, аб абарончым складніку. Было заяўлена аб перакідцы кантынгентаў і войскаў Польшчы да граніц і да тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Гэта выклікала адпаведную заклапочанасць у кіраўніцтва нашай дзяржавы. 8 верасня 2025 года мы накіравалі запыт у Польшчу з просьбай растлумачыць такую незвычайную ваенную актыўнасць на тэрыторыі суседняй дзяржавы. Ва ўстаноўлены тэрмін ваенна-палітычнае кіраўніцтва Польшчы дало адказ аб параметрах вучэння, якое праводзіцца на іх тэрыторыі, і патлумачыла нам усе нашы запыты і нюансы. Гэта сведчыць пра канструктыўную размову».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

**Фота БелТА.**

# ВЯЛІКАЯ СПРАВА АГУЛЬНЫМІ НАМАГАННЯМІ

## Як Лельчыцы Гомельскай вобласці рыхтуюцца да абласных «Дажынак»

2025 ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

**Сёлета названы гарадскі пасёлак упершыню стане галоўнай пляцоўкай абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі «Дажынкі» на Гомельшчыне. Падрыхтоўка да свята ідзе ўжо некалькі месяцаў і цяпер выходзіць на фінішную прамую.**

Сімвалічна, што ў Год добраўпарадкавання, напярэдадні першай у гісторыі Лельчыц сустрэчы абласных «Дажынак», райцэнтр перажывае маштабнае абнаўленне: добраўпарадкаваны двары, адрамантаваны ўстановы гарпасёлка, створаны новыя зоны для адпачынку. Падрыхтоўка да фестывалю працаўнікоў вёскі аб'яднала ўсе прадпрыемствы і арганізацыі раёна. Калектывы банкаў, пошты, камунальных службаў, устаноў культуры і адукацыі, прадстаўнікі дэпутацкага корпуса, райвыканкама і ўсе неабыякавыя жыхары гарпасёлка за гэты час не раз выходзілі на суботнікі, наводзілі парадак. Адным з актыўных удзельнікаў грамадскай ініцыятывы па добраўпарадкаванні родных Лельчыц стаў калектыў раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці.





**Праведзена сур'ёзная мадэрнізацыя сацыяльна значных аб'ектаў. Сярод падарункаў да свята пасёлку і раёну — мадэрнізаваныя цэнтральная кацельня і цэнтральная раённая бальніца, ЗАГС, адрамантаваны школа мастацтваў, кінатэатр, раённы цэнтр культуры і народнай творчасці, Лельчыцкі дзяржаўны каледж, гасцініца, шматкватэрны жылы дом, аўтавакзал, ТЦСАН.**



— Мы ставім перад сабой мэту — зрабіць прастору вакол нас сучаснай і ўтульнай. Гэта наш унёсак у агульны вынік, — перакананa **дэпутат Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў, кіраўнік раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Іна НЕКРАШЭВІЧ**.

Усе апошнія месяцы перад святам Лельчыцы нагадвалі «гарадок фантанаў» — быццам «дырыжыравала» разнастайнай палівальнай тэхнікай цэлае войска байцоў камунальнага фронту: палівалі свежавысаджаныя клумбы, газоны, самыя неверагодныя кветкавыя кампазіцыі.

Грунтоўнае абнаўленне правялі ў цэнтры гарадскога пасёлка. На пляцоўцы каля кінатэатра «Партызан» — адным з цэнтральных месцаў адпачынку і баўлення вольнага часу — камунальныя службы стварылі новую ландшафтную кампазіцыю. Тут з'явіліся кветкавыя формы, дэкаратыўныя элементы і сучаснае асвятленне. Сёння гэта абноўленая тэрыторыя — вельмі яркая візітоўка населенага пункта.

Дарэчы, да падрыхтоўкі Лельчыц да свята далучыліся і суседнія раёны. Спецыялісты з гарпасёлка Акцябрскі дапамаглі ў добраўпарадкаванні, устаноўцы малых архітэктурных форм, ландшафтным будаўніцтве і афармленні тэрыторыі каля кінатэатра «Партызан».

Маштабныя работы прайшлі і ў мясцовым парку. Над стварэннем прыгожай зялёнай зоны тут працавалі ў тым ліку прадстаўнікі райвыканкама і ТЦСАН. У парку абноўлены пешаходныя дарожкі, адкрыты новыя зоны адпачынку, сучасная гульнявая пляцоўка для дзяцей і шматфункцыянальная спартыўна-гульнявая зона для аматараў здаровага ладу жыцця. Цяпер, як з гонарам за свой населены пункт адзначаюць жыхары Лельчыц, іх парк будзе вельмі камфортны для людзей усіх пакаленняў.

Між тым для Лельчыц падрыхтоўка да фестывалю працаўнікоў вёскі стала і магчымасцю рэалізаваць шэраг праектаў комплекснага абнаўлення. Праведзена сур'ёзная мадэрнізацыя сацыяльна значных аб'ектаў. Сярод падарункаў да свята пасёлку і раёну — мадэрнізаваныя цэнтральная кацельня і цэнтральная раённая бальніца, ЗАГС, адрамантаваны школа мастацтваў, кінатэатр, раённы цэнтр культуры і народнай творчасці, Лельчыцкі дзяржаўны каледж, гасцініца, шматкватэрны жылы дом, аўтавакзал, ТЦСАН. Абноўленыя аб'екты адкрыюцца напярэдадні свята або ў дзень правядзення фестывалю працаўнікоў вёскі.

Як перакананы працаўнікі калектываў і арганізацый Лельчыц, якія актыўна падтрымалі добраўпарадкаванне роднага населенага пункта, правядзенне абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі ў Лельчыцах стане не толькі падзеяй рэгіянальнага маштабу, але і важным крокам у развіцці райцэнтра.

— Падрыхтоўка да правядзення свята дала вельмі значны імпульс да развіцця Лельчыц. Праведзены капітальны і бягучы рамонт, рэканструкцыя больш як 180 аб'ектаў, — адзначыў **старшыня Лельчыцкага райвыканкама Сяргей ДЫЛЮК**. — Безумоўна, не можа не радаваць тое, што новыя, вельмі запатрабаваныя аб'екты, якія з'явіліся як падарункі да свята, будуць яшчэ доўгія гады служыць і цешыць вока нашых жыхароў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота lelchitsy.by**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Краснодворцы»** (продавец)
проводит открытый аукцион
по продаже недвижимого имущества:

**Лот № 1: здание бани**
**с инвентарным номером 644/С-53302 площадью 180,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085402601000351 (право аренды по 17.11.2034) площадью 0,0617 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, аг. Жабин, ул. Юбилейная, 8А.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **37 908,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 790,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 10 %.**

**Лот № 2:**
**здание комплексного приемного пункта**
**с инвентарным номером 644/С-34045**
(составные части и принадлежности: уборная, сарай)
**площадью 146,1 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625085409301000280 (право постоянного пользования) площадью 0,2083 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, д. Погост-1, ул. Зиновьева, 45А**.

Начальная цена с НДС (20 %) – **29 052,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **2 905,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 10 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 07.06.2025.

Аукцион состоится **29.09.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.09.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8029) 140-29-49.**

УНП 600071008



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Белинвестбанк»**
(Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 30 сентября 2025 г.**

**Лот № 1:**
Здание одноквартирного жилого дома
с инв. № 600/С-106123 площадью 212,2 кв. м.

Начальная цена без учета НДС – 543 000,00 бел. руб.
Задаток – 54 300,00 бел. руб.

Капитальное строение с инв. № 600/С-106123 расположено на земельном участке с кадастровым номером 623680601101001439, площадь (га): 0,2450.
Право аренды.
Срок действия: с 22.11.2023 по 02.10.2122.
**Адрес:** Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Боровляны, ул. Речная, 25.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов, размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **26.09.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52;**
**torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182



Свидетельство о государственной регистрации учреждения «Центр развития творческих инноваций «Креативные индустрии»
(регистрационный номер 193000660)
**считать недействительным в связи с утерей**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | |
|---|---|
| ЛОТ № 1 | **Капитальное строение с инв. № 500/С-535,** расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/8, площадью 1165,1 кв. м, наименование – Ремонтно-строительное управление, назначение – Здание административно-хозяйственное, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000006008958 площадью 0,0926 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования. Объект недвижимости обременен правом аренды. На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0102 га, ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0168 га |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 632 917,23** | **Задаток, BYN** | **163 291,72** | **Шаг аукциона** | 5 % |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ» Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62. Тел. +375 (17) 388 90 99 E-mail: mpovt@mpovt.by |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 044 550 75 70 (Тарас) |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 30 сентября 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **01 октября 2025 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «БЕЛСОЮЗПЕЧАТЬ»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения.

**Электронные торги состоятся 20.10.2025.**

**Лот № 1: грузовой вагон FORD TRANSIT,**
кузов (рама) № WF0XXXTTFXAT27830, 2010 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 11 528,11 руб.

**Лот № 2: грузовой фургон IVECO DAILY 65 C 15,**
кузов (рама) № ZCFC65A2105734802, 2008 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 6 033,40 руб.

Место нахождение Лотов №№ 1–2:
г. Минск, ул. Лукьяновича, 12.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# МІНСКУ — 958!

## Як у сталіцы адсвяткавалі Дзень горада

Да 958-годдзя ва ўсіх раёнах Мінска падрыхтаваліся: масавыя гулянні мясцовых жыхароў і гасцей працягваліся з раніцы і да позняй ночы. Гэтаму спрыяла разнастайная святочная праграма, якая ўключала і шоу-конкурс калясак, і фестываль гістарычнай рэканструкцыі. Больш за трыццаць інтэрактыўных спартыўных зон падрыхтавалі для ўсіх жадаючых каля Палаца спорту. Акрамя таго, у Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага разгарнуўся «Фестываль прафесій», а яшчэ адбыліся міжнародныя спаборніцтвы «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік».





### БЫЛІ РОЗНЫЯ СТАРОНКІ Ў ГІСТОРЫІ НАШАГА ГОРАДА

Стартавалі мерапрыемствы з урачыстай цырымоніі ўскладання кветак да абеліска «Мінск — горад-герой». У ёй узялі ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў горадзе Мінску Наталля Качанава, старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў, старшыня Мінскага гарсавета Арцём Цуран, міністр унутраных спраў Іван Кубракоў.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што Мінск можна лічыць узорам народнага адзінства ў Беларусі: «Людзі, якія жывуць і працуюць тут, тыя прадпрыемствы, установы і грамадскія арганізацыі пераконваюць мяне ў гэтым. Былі розныя старонкі ў гісторыі нашага горада і нашай краіны, мы гэта памятаем. Мы сталі адзначаць Дзень народнага адзінства, бо разумеем, што толькі ў адзінстве народа можна захаваць мір і спакой, а самае галоўнае — суверэнітэт і незалежнасць краіны».

Да знакавага для беларусаў месца прыйшлі прадстаўнікі Мінскага гарвыканкама, раённых адміністрацый, грамадскасці, прадпрыемстваў горада, сілавых ведамстваў, а таксама дэпутаты, госці з гарадоў-пабрацімаў, ветэраны, моладзь.

«У Дзень горада мы збіраемся каля стэлы «Мінск — горад-герой», каля помніка тым людзям, якія сваім подзвігам на палях бітваў, у партызанскіх лясах, падполлі кавалі перамогу. А потым гэтыя ж людзі, прыйшоўшы з фронту, аднаўлялі наш горад, — адзначыў **старшыня Мінскага гарсавета Арцём ЦУРАН.** — Сёння на вуліцах беларускай сталіцы — шчаслівыя гараджане. Самае галоўнае — гэта людзі, нашы мінчане. Напярэдадні Дня горада была вельмі вялікая колькасць ушанаванняў працаўнікоў, жыхароў горада, якія кожны дзень робяць горад лепшым».

У ліку прадстаўнікоў замежных дэлегацый на цырымоніі прысутнічаў **намеснік мэра горада Омска Алег БАЛАНАЎ**. Ён адзначыў канструктыўнае ўзаемадзеянне двух гарадоў — Мінска і Омска: «На працягу даволі працяглага часу ў нас выбудоўваюцца цёплыя ўзаемаадносіны. Мы назіраем і дзелімся вопытам з вашым горадам. Больш за ўсё, вядома ж, нас здзіўляе і пакарае вашы чысціня, добраўпарадкаванне, культура, дабрыня і гасціннасць. Амічы вельмі шануюць сяброўства і ўзаемадзеянне з горадам Мінскам. Нашы народы адзіныя. Мы ганарымся тым, што нашы гарады з'яўляюцца пабрацімамі».

Між тым у Мінск на святочныя выхадныя прыбылі дэлегацыі і іншых расійскіх гарадоў, у прыватнасці Новасібірска, Ніжняга Ноўгарада, Мурманска, Санкт-Пецярбурга.

### МОЦНЫЯ, СМЕЛЫЯ, АДВАЖНЫЯ...

Насычаная праграма разгарнулася ва ўсіх раёнах горада. У прыватнасці, каля цэнтральнага ўвахода ў парк Перамогі прайшлі міжнародныя спаборніцтвы «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік». Удзел узялі вопытныя спецыялісты з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама госці з Санкт-Пецярбурга і Валагодскай вобласці Расіі — усяго больш за 100 чалавек.

Мерапрыемства было прымеркавана да 80-годдзя Вялікай Перамогі. Акрамя зоны для спаборніцтваў, тут таксама арганізавалі забавы для дзяцей: працавалі інтэрактыўныя пляцоўкі, можна было пасядзець у кабіне спецыяльнага транспарту, прымераць экіпіроўку ратавальнікаў і пабываць у задымленым памяшканні.

**Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ** адзначыў, што правядзенне мерапрыемстваў, звязаных са службай органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, ужо стала добрай традыцыяй: «Сёння вельмі прыемна бачыць тут сапраўды моцных, смелых, адважных людзей, якія кожны дзень, рызыкуючы сваім жыццём, абараняюць нашых грамадзян. Прафілактычная работа, якую вы праводзіце сярод насельніцтва, дарагога варта. Вы паказваеце маладому пакаленню, наколькі важна быць моцнымі, смелымі, спрытнымі, каб спраўляцца з усімі цяжкасцямі, якія ўзнікаюць у вашай службе».

### ПЕРАНЕСЦІСЯ Ў СТАРАЖЫТНАСЦЬ? ЛЁГКА!

У зялёнай зоне на скрыжаванні праспектаў Машэрава і Пераможцаў прайшоў Міжнародны фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Мінск старажытны». Тут разбілі палявыя лагеры воіны розных эпох. І ўсе яны, безумоўна, былі звязаны з гісторыяй Беларусі і яе сталіцы. Сёлета сабралася каля паўтысячы рэканструктараў з розных краін.

Гэты фестываль — адна з візітных картак святкавання Дня горада. Упершыню ён прайшоў у 1997 годзе, калі Мінск адзначаў 930-годдзе. Першапачаткова гэта быў рыцарскі фэст, які з часам трансфармаваўся ў сучасны «Мінск старажытны», які радуе мінчан і гасцей горада больш за 10 гадоў.

Упершыню ў конным турніры, які стаў часткай праграмы, узяў удзел прадстаўнік Кітая — Хан Юшуань. «Для мяне вялікі гонар стаць часткай фестывалю, вялікага свята Мінска, — сказаў ён. — Мне важна ўбачыць, як такія турніры праходзяць у Беларусі, атрымаць бясцэнны вопыт. Бо тут усё абсалютна не так, як у мяне дома. Іншыя традыцыі, узбраенне, правілы. Вельмі рады, што магу акунуцца ў гэта грандыёзнае дзейства».

**А ЎВЕЧАРЫ НА НЯМІЗЕ...**



**Падарункам да Дня горада ад Мінгарвыканкама і кампаніі A1 стала выступленне на вялікім бясплатным канцэрце папулярнага рэп-выканаўцы МОТа і іншых маладзёжных артыстаў. Цудоўны сюрпрыз ацанілі 120 тысяч жыхароў і гасцей сталіцы.**

УНП 101528843

### «БАЦЬКАВЫ ДЗЕЦІ» — КАЛЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

Яшчэ адно даволі незвычайнае мерапрыемства аб'яднала сем'і з маленькімі дзецьмі — шоу-конкурс калясак «Бацькавы дзеці». Для ўдзелу бацькі афармлялі першы транспартны сродак у такіх намінацыях, як «Нацыянальны каларыт» (у нацыянальных традыцыях), «Тэхнакаляска» (у вобразе любога транспартнага сродку), «Спартыўная» (для спартсменаў і балельшчыкаў), «Каляска арыгінальнага жанру» (самыя крэатыўныя і незвычайныя рашэнні ў афармленні).

### МІНСК — ГОРАД СПАРТЫЎНЫ

Каля Палаца спорту мінчане і госці змаглі наведаць святочны кірмаш і ўзяць удзел у спартыўна-масавым свяце «Алімпійскі дзень», якое распачалося з прыбыццём мотапарада H.O.G Rally Min.

Мінск — горад спартыўны, сотні тысяч людзей тут займаюцца рознымі відамі спорту, адзначыў старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў. Футбол, баскетбол, бокс... Пляцовак для заняткаў падрыхтавалі шмат! А новым пунктам праграмы сёлета сталі гонкі на драганботах — заплывы студэнтаў ВНУ прайшлі ў акваторыі ракі Свіслач.

**Віцэ-прэзідэнт НАК Дзмітрый ДАЎГАЛЁНАК** адзначыў: «Мінчан цяжка здзівіць, але дзякуючы ўдзелу ў фестывалі «Вытокі» спартыўныя федэрацыі атрымалі неабходны досвед у гэтым плане. Кожная пляцоўка абрасла новым цікавым абсталяваннем, якое асабліва спадабалася дзецям». Для іх, дарэчы, у выхадныя правялі алімпійскі квэст, які стаў галоўнай падзеяй. Каб атрымаць каштоўныя прызы, юныя ўдзельнікі спаборнічалі за залатую, сярэбраную і бронзавую пячаці.

А фінальным акордам Дня горада па традыцыі стаў святочны феерверк. Яшчэ раз са святам, любімая сталіца!

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота БелТА.**

# НА СВЯТОЧНАЙ ХВАЛІ

## Гомель адзначыў 883-і дзень нараджэння

Шэсці, канцэрты, фестывалі і спартыўныя спаборніцтвы... У Гомелі прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя 883-годдзю заснавання горада над Сожам.





Каб далучыцца да ўрачыстых мерапрыемстваў і падзяліць радасць свята з гамяльчанамі, у абласны цэнтр прыехалі 17 афіцыйных дэлегацый. Іх урачысты прыём прайшоў у палацы Румянцавых-Паскевічаў. Гамяльчане і госці горада акунуліся ў атмасферу маштабнага шэсця, якое прайшло на цэнтральнай плошчы імя Леніна. У святочнай калоне шматдзетныя сем'і пранеслі гіганцкі сцяг горада. Дынаміку сучаснага Гомеля, яго імкненне да руху наперад падкрэсліла шэсце ў калоне веласіпедыстаў, ролераў, монацыклістаў у касцюмах рысяў.

Маладзёжную сталіцу Беларусі — 2025 прадставілі дэлегацыі раённых адміністрацый Гомеля. У шэсці ўзялі ўдзел тысячы гамяльчан — прадстаўнікоў розных прафесій. Па плошчы прайшлі калектывы прамысловых прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый. Вялізныя платформы з узорамі прадукцыі наглядна дэманстравалі эканамічны патэнцыял Гомеля.

Горад ператварыўся ў суцэльную яркую канцэртную пляцоўку. Музыка гучала без перапынкаў да самай ночы, а яго цэнтральная частка стала вялікім танцполам пад адкрытым небам. Яшчэ адным цэнтрам прыцягнення жыхароў і гасцей стала набярэжная Сожа. Тут гамяльчан і гасцей горада сустракаў гастранамічны фэст «Гігантаманія». Адной з галоўных падзей гэтай святочнай лакацыі стала прэзентацыя «Дэсерту для волата» — глазураванага сырку вагой 20 кілаграмаў — падарунка ад прадпрыемства «Мілкавіта».

Фестываль «Муздрайв-фэст» традыцыйна стаў месцам сустрэчы аматараў вулічнай музыкі. Удзел у ім узялі сольныя выканаўцы і кавер-групы з розных рэгіёнаў Беларусі. Неверагодна яркім фіналам дня святкавання стаў першы ў гісторыі горада фестываль феерверкаў «Агні любімага Гомеля». Больш за гадзіну над Сожам працягвалася вогненнае шоу. Кожны стрэл быў не проста салютам, а візітоўкай прадпрыемства, якое яго падрыхтавала. Падарылі гораду гэты маляўнічы і эмацыянальны вечар 18 прадпрыемстваў — удзельнікаў фестывалю.

Святочная праграма працягнулася 14 верасня. У тэрыторыю маладзёжнага драйву ператварылася вуліца Ланге. Тут можна было праехаць на дрыфт-тройках, паўдзельнічаць у вулічным баскетболе, брэйк-данс батлах і турніры «Самы моцны гамяльчанін». Усе ахвотныя далучыліся да фестывалю графіці. Запамінальным акцэнтам святочнай праграмы стала светлавое шоу на фасадзе медыцынскага ўніверсітэта.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф.1 www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «АТЛАНТ», 220035, г. Минск, проспект Победителей, 61 |

**Предмет электронных торгов**
**Недвижимое имущество, реализуемое одним лотом по адресу: г. Минск, ул. Сапёров, 5**

| Наименование | Инв. номер |
|---|---|
| 1. Здание физкультурно-оздоровительного комплекса (Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения) общей площадью 7412,2 кв. м | 500/С-35353 |
| 2. Открытые плоскостные спортивные сооружения (Сооружение специализированное физкультурно-оздоровительного и (или) спортивного назначения) общей площадью 4440,5 кв. м | 500/С-1011479 |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 500000000007007980:** предоставлен на праве аренды по 30.09.2050 г. для обслуживания здания и сооружения специализированных физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения общей площадью 1,4557 га | |
| 3. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть (Сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 499,5 м | 500/С-1028144 |

**Начальная цена с НДС 20 % – 22 641 681,07 бел. руб.**

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB301200483500 80226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 20 (двадцать) рабочих дней со дня завершения электронных торгов**

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете Звязда от 16.07.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **13.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **10.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Алексеевичи-Агро», Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Немержа, ул. Ленина, д. 34 |

**Предмет электронных торгов –**
**имущество, реализуемое одним.**
Адрес: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Немержанский с/с, 16, 16/1, 16/2, 16/3, 0,3 км восточнее д. Переспа

1. **Молочный блок**, инв. номер 121/С-18347, общей площадью 94 кв. м. 2. **Телятник**, инв. номер 121/С-18348, общей площадью 1584,7 кв. м. 3. **Склад № 3,** инв. номер 121/С-18349, общей площадью 180,2 кв. м. 4. **Здание трансформаторной**, инв. номер 121/С-18350, общей площадью 47,8 кв. м.
**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122084500001000199:** предоставлен на праве аренды по 27.08.2073 г. общей площадью 3,1723 га для строительства и обслуживания зданий и сооружений фермы

**Начальная цена, с НДС 20 % – 29 976,00 бел. руб. (снижена на 80 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB301200 4835008022600 0 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 23.08.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 07.10.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **06.10.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а. УНП 100233809. |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронного аукциона**

**Административное помещение 158,4 кв. м** (500/D-7988231960).
**Адрес: г. Минск, ул. Мельникайте, 2-40**

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 517 645,48 бел. руб.**
(снижена на 35 %)
Шаг торгов – 5 % от начальной цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение организатору торгов 3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущая публикация извещения в газете «Звязда» от 22.08.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевоблавтотранс»**
(г. Могилев, ш. Гомельское, 1, тел. 8-0222-46-71-90)

**Электронные торги состоятся 14.10.2025 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1. Автобус MAZ 103465,**
тип кузова – вагон, кузов (рама) № Y3M103465C0004880, р/з – АВ 8059-6, г. в. – 2012.
**Начальная цена продажи: 24 480,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 2 448,00 бел. руб.**

**Лот № 2. Автомобиль UAZ 3163-343,**
тип кузова – внедорожник универсал, кузов (рама) № 316300A0004301, XTT316300A0004301, р/з 8700 ЕС-6, г. в. – 2010.
**Начальная цена продажи: 14 400,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 1 440,00 бел. руб.**

**Местонахождение объектов:**
**Могилевская обл., г. Кировск, ул. Гагарина, 18.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в торгах: по 10.10.2025 до 11.00.

Порядок оформления участия в торгах, порядок их проведения, а также определения лица, выигравшего торги и порядок оплаты вознаграждения, содержится в информации о проведении торгов, опубликованной на сайте Организатора торгов GOSTORG.BY.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за 3 дня до даты торгов. Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней с даты торгов. Извещение также размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, и на торговой площадке GOSTORG.BY.

Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

**Признать недействительными** бланки с определенной степенью защиты по обязательному медицинскому страхованию иностранных граждан и лиц без гражданства, временно пребывающих или временно проживающих в Республике Беларусь, формы 2РН/РП серии БВ, № 3506350-3506351, в количестве 2 шт., представительства Белгосстраха по Червенскому району.

# «КАБ МОЛАДЗЬ ЗАСТАВАЛАСЯ, ТРЭБА СТВАРАЦЬ УМОВЫ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Маладыя спецыялісты па ўсёй краіне прыступілі да работы па размеркаванні з 1 жніўня. І вось прайшло крыху больш за месяц. Каб даведацца, як адчуваюць сябе ўчарашнія студэнты на сваіх першых працоўных месцах, мы накіраваліся ў Навагрудак.

## «У МАЛЕНЬКІХ ГАРАДКАХ КВАЛІФІКАЦЫЯ РАСЦЕ ХУТЧЭЙ»

— Магчыма, размеркаванне ў Навагрудак кагосьці не надта ўзрадавала, — звярнуўся да аўдыторыі **старшыня Навагрудскага райвыканкама Сяргей ЧАРКОЎСКІ** на сустрэчы з маладымі медыкамі. — Але ў маленькіх гарадках вы неўзабаве станеце практыкамі, ваша кваліфікацыя будзе расці хутчэй.

**Сёння ў Навагрудскім раёне актыўна рамантуюцца і камплектуюцца сучасным абсталяваннем паліклінікі, а таксама лячэбныя карпусы цэнтральнай раённай бальніцы. У найбліжэйшыя месяцы будзе вырашана пытанне аснашчэння ЦРБ апаратам МРТ, у перспектыве — устаноўка і больш высокатэхналагічных дыягнастычных сістэм.**

Другі найважнейшы кірунак — забеспячэнне новых кадраў камфортным жыллём. У планах развіцця Навагрудка — будаўніцтва гарадка маладых спецыялістаў. Як адзначыў старшыня райвыканкама: «Будаваць будзем з панэльных канструкцый, гэта павысіць аператыўнасць. Каб моладзь затрымлівалася, трэба ствараць умовы».

**Зрэшты, і сёння ўсе маладыя спецыялісты, якія прыехалі ў жніўні ў Навагрудак, забяспечаны жыллём. У прыватнасці, атрымалі трохпакаёвую і дзве двухпакаёвыя кватэры.**

Трэці аспект, што наўпрост уплывае на рашэнне маладога спецыяліста застацца на працоўным месцы пасля завяршэння абавязковай адпрацоўкі, — магчымасці для праводзін вольнага часу.

Неўзабаве ў Навагрудку з'явіцца ролерны цэнтр (пад праект адведзена памяшканне 620 кв. м). А ў найбліжэйшы час адкрыецца «Навагрудская Зыбіцкая» — фудкорт з прымальнымі цэнамі, смачнай ежай, утульнымі кавярнямі, дзе будуць выступаць кавер-бэнды і музычныя гурты розных кірункаў.

## «У ЗАЛЕ ПРЫСУТНІЧАЮЦЬ І МАЕ ВЫПУСКНІКІ»

Згодна з загадам Міністэрства аховы здароўя, у медыцынскіх ВНУ арганізаваны аддзелы па падтрымцы маладых спецыялістаў, расказаў у ходзе сустрэчы **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар ЖУК.** Да аўдыторыі ён звярнуўся не толькі як парламентарый, але і як рэктар Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта:

— У зале прысутнічаюць і мае выпускнікі, — не без гонару ўдакладніў ён.

— Мы заўсёды даступныя і адкрытыя, чакаем зваротнай сувязі, як і мясцовыя органы ўлады. На ўсіх узроўнях у краіне заклапочаныя тым, каб моладзь прыходзіла ў рэгіёны і заставалася тут. Замацоўвальнасць маладых спецыялістаў, што датычыцца аховы здароўя, па Гродзенскай вобласці — на ўзроўні 80 %.

**Як паказвае практыка апошніх гадоў, маладыя спецыялісты пасля абавязковай адпрацоўкі — 2 гады для бюджэтнікаў і 5 гадоў для «мэтавікоў» — у большасці застаюцца на сваіх працоўных месцах, сказаў парламентарый. Дасягаецца гэта дзякуючы таму, што мясцовыя органы ўлады зацікаўлены ў прафесійным росце маладых кадраў, у іх самарэалізацыі і ва ўзроўні іх жыцця.**

## «ЧАКАННЕ І РЭАЛЬНАСЦЬ СУПАЛІ»

— Сустрэлі нас у Навагрудку вельмі цёпла, — падзялілася ўражаннямі малады спецыяліст, урач-нарколаг Анастасія Сазонка.

Анастасія — з Ліды, але не шкадуе, што не трапіла па размеркаванні ў родны горад: кажа, у Навагрудку ўсё склалася добра.

— Тут і настаўніцтва на вышэйшым узроўні, і працаваць камфортна і цікава. Перыяд адаптацыі на першым працоўным месцы ў нас ужо скончыўся, — працягвае суразмоўніца. — Спачатку, вядома, было няпроста, але гэта звычайныя жыццёвыя складанасці. А ўмовы працы тут вельмі годныя, калектыў і кіраўніцтва — добразычлівыя, за гэты месяц мы неаднаразова сустракаліся з адміністрацыяй раёна. Усе за нас перажываюць, клапоцяцца, і гэта вельмі прыемна.

На спецыяльнасць «псіхіятр-нарколаг» Анастасія паступала мэтанакіравана.

— Такія вузкія спецыялісты ў медыцыне заўсёды запатрабаваныя, — тлумачыць яна.

Прыйшлося вытрымаць высокі конкурс, кажа суразмоўца, але ўжо сёння відавочна, што з выбарам медыцынскай спецыялізацыі не памылілася: на працы мы праводзім больш за 50 % свайго часу, а значыць, яна павінна быць цікавай і карысным людзям.



Маладыя хірургі Вольга і Андрэй БЕКЕШ.

**Вольга і Андрэй Бекеш прыбылі на першае працоўнае месца ўжо як сямейная пара: ажаніліся адразу пасля атрымання дыпломаў. Вольга родам з Гомельшчыны, Андрэй — з Гродна, па спецыяльнасці абодва — хірургі.**

— Мы першапачаткова хацелі трапіць у Навагрудскую бальніцу, яе нам параіў старэйшы калега. Так што чаканне і рэальнасць супалі, — кажа Вольга.

А вось арэнднае жыллё — двухпакаёвая кватэра — стала для сям'і маладых урачоў сапраўдным сюрпрызам.

— Свежы рамонт, зручнае размяшчэнне, добры па інфраструктуры раён, недалёка ад бальніцы, — адзначыла Вольга. — Умовы для маладых спецыялістаў у Навагрудку створаны самыя камфортныя.

Падтрымка старэйшых калег, годныя ўмовы пражывання, магчымасці для прафесійнага росту — тыя «цаглінкі», з якіх складваецца жаданне звязаць свой лёс з тым або іншым населеным пунктам, кажуць маладыя спецыялісты. У Навагрудку такім чынам на практыцы стварaeцца перспектыва горада і раёна.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# ХАЙ АЎТО АДПАЧНЕ



## 80 % ЗАБРУДЖВАННЯЎ ПАВЕТРА — З-ЗА ТРАНСПАРТУ

Гэта хвароба любога вялікага горада, і Мінск — не выключэнне. Для паступальнага паляпшэння экалагічнай абстаноўкі ў мегаполісе арганізоўваецца шэраг мерапрыемстваў, расказаў **старшыня Мінскага гарадскога камітэта па прыродных рэсурсах Андрэй ДРАГУН.** У прыватнасці, на сёння запланаваны велапрабег, які стартуе ад гасцініцы «Аква-Мінск» і



працягнецца да стэлы «Мінск — горад-герой». Яшчэ адна акцыя — «На работу на веласіпедзе!». Пройдуць і лекцыі на тэму велаexisting, спаборніцтвы на веласіпедах, майстар-класы па фігурным ваджэнні.

Асноўнае мерапрыемства запланавана на 22 верасня — у Міжнародны дзень без аўтамабіля. Каля Палаца спорту з гэтай нагоды будуць прадстаўлены розныя інтэрактыўныя пляцоўкі і лакацыі. Традыцыйна Мінскім гарадскім Саветам дэпутатаў прынята рашэнне аб бясплатным праездзе ў гэты дзень на грамадскім транспарце пры прад'яўленні пасведчання вадзіцеля і пасведчання аб рэгістрацыі транспартнага сродку.

## 380 КІЛАМЕТРАЎ ВЕЛАДАРОЖАК

У сталіцы зацверджана канцэпцыя развіцця велаpyxу да 2030 года. Яна прадугледжвае ўладкаванне веладарожак працягласцю да 380 кіламетраў. Па даных на 1 верасня бягучага года, 350 кіламетраў ужо добраўпарадкавана, з іх сёлета — больш за 40. Як адзначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік аддзела фізкультурна-аздараўленчай работы і турызму галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінскага гарвыканкама Алеся МАСТАВАЯ,** такія ўчасткі паступова з'яўляюцца ва ўсіх раёнах горада. Для зручнасці выконваюцца работы па паніжэнні бартавога каменя, устанаўліваюцца спецыяльныя святлафоры, знакі, абнаўляецца разметка, абсталёўваюцца велапаркоўкі.

Спецыяліст падкрэсліла: для гараджан і гасцей у сталіцы дзейнічаюць аўтаматычныя пункты пракату (парк налічвае 15 тысяч самакатаў і столькі ж веласіпедаў). Калі ёсць патрэба, пункты пракату таксама функцыянуюць у дзяржаўных установах, фізкультурна-аздараўленчых цэнтрах.

## 2/3 ПАСАЖЫРАПАТОКУ ЗАБЯСПЕЧВАЕ ЭЛЕКТРАТРАНСПАРТ

Больш за тое, прымаюцца адпаведныя меры па павелічэнні яго долі ў парках «Мінсктранса», заявіў **дырэктар Дзяржаўнага прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь» Юрый СУПРАНОВІЧ.** Акрамя таго, падаўжаюцца лініі метрапалітэна. А яшчэ ў перспектыве з'явіцца буйны транспартна-перасадачны вузел у раёне плошчы Бангалор.

У новым жылым раёне «Паўночны Бераг» канцэптуальна прыярытэт аддаецца электратранспарту. Электробусы на пачатковым этапе будуць падвозіць гараджан да станцый метро «Пушкінская» і «Акадэмія навук», а з адкрыццём новых станцый арганізуюць дадатковыя хуткасныя маршруты.

Штодня грамадскі транспарт перавозіць каля 1,7 мільёна пасажыраў, каля 750 тысяч прыпадае на сталічную падземку. У цэлым дзве трэці пасажырапатоку забяспечвае электратранспарт. У тым ліку на вуліцах горада сталі часцей выкарыстоўвацца тралейбусы з павялічаным аўтаномным ходам.

Практычна палова рухомага складу, які выкарыстоўваецца ў гарадскіх перавозках, — экалагічна чыстыя віды транспарту. Парк налічвае 708 тралейбусаў, 137 вагонаў трамваяў і 108 электробусаў. І гэтая лічба працягне расці. У цяперашні час электратранспартам абслугоўваюцца 64 тралейбусныя маршруты, 13 з іх маюць участкі бескантактавай сеткі. Электробусамі на пастаяннай аснове абслугоўваецца 12 былых аўтобусных маршрутаў.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

СТАЛІЧНЫ ЧАС

# АД «ПЕСНЯРОЎ» ДА ВЫЦІНАНКІ

## Падчас Дзён Мінска ў Маскве прадставяць усю палітру беларускай культуры

Дні Мінска ў Маскве пройдуць 18—21 верасня. І гэта не толькі свята культуры, спорту і сяброўства, але і ў першую чаргу — новыя магчымасці для бізнесу, якія, несумненна, прынясуць вынік. Такім меркаваннем падзялілася намеснік старшыні камітэта эканомікі Мінскага гарвыканкама Таццяна СЕЛІВОНІК.



Яна нагадала, што ў снежні 2024 года падчас сустрэчы старшыні Мінскага гарвыканкама Уладзіміра Кухарава з мэрам Масквы Сяргеем Сабяніным былі дасягнутыя дамоўленасці аб правядзенні ў 2025 годзе Дзён Мінска ў Маскве. Паводле яе слоў, мэтай дадзенага мерапрыемства стала развіццё супрацоўніцтва, новых праектаў у розных сферах: «З 18 да 21 верасня адбудзецца шмат культурных падзей, выстаўка-кірмаш беларускіх тавараў на Цвярской плошчы, будуць праведзены спартыўныя мерапрыемствы».

Пройдзе таксама круглы стол, тэлемасты па розных сферах: медыцына, турызм, нашы ўстановы адукацыі падзеляцца вопытам. Па выніках будуць падпісаны пагадненні аб далейшым супрацоўніцтве. «Ключавой падзеяй стане правядзенне бізнес-форуму «Мінск і Масква: новы драйвер развіцця». Ужо зарэгістравана больш за 70 удзельнікаў форуму з Беларусі і Масквы. Яны падзеляцца вопытам і раскажуць пра свае прадпрыемствы. Паўдзельнічае вельмі шмат спікераў. Банкаўскія ўстановы раскажуць пра інструменты падтрымкі экспарту беларускіх прадпрыемстваў. Па выніках форуму таксама плануецца правядзенне цырымоніі падпісання кантрактаў на мільённыя сумы», — рэзюмавала Таццяна Селівонік.

**Намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама Святлана СІЛІЧ** расказала аб канцэртнай праграме, выстаўках беларускіх рамеснікаў і майстар-класах, якія пройдуць падчас Дзён Мінска ў Маскве: «Культурная праграма стане, без перабольшання, яркай падзеяй гэтых дзён. Мы вязём у Маскву найлепшыя калектывы і народных умельцаў Мінска, якімі па праве ганарымся. Канцэртная праграма ў суправаджэнні Нацыянальнага Прэзідэнцкага аркестра Беларусі адкрые Дні Мінска ў Маскве. У ёй возьмуць удзел Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» і іншыя вядомыя беларускія артысты. Гледачы пачуюць сучасныя хіты, залатыя шлягеры і мелодыі, якія сталі сапраўднымі сімваламі Беларусі».

У 14 гандлёвых павільёнах будзе прадстаўлена беларуская прадукцыя, адзначыла **намеснік генеральнага дырэктара ГА «Сталічны гандаль і паслугі» Алена ЦАРЫКАВА.** Яна падкрэсліла, што кірмаш беларускіх тавараў пройдзе ў самым цэнтры Масквы з 18 да 21 верасня на фестывальнай пляцоўцы «Маскоўскія сезоны на Цвярской».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**Фота БелТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор** | **ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1** |
| **Продавец** | **ОАО «Гомельдрев», 246042, г. Гомель, ул. Достоевского, 3** |

**Аукцион состоится 01.10.2025 в 11.00**
по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.
**Заявление на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 16.09.2025 по 30.09.2025 до 16.00** по указанному адресу.
**Организатор аукционных торгов:**
**☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

**Предмет аукциона**

**ЛОТ № 1. Семь капитальный строений (здание многофункциональное** с инв. № 350/С-225870, пл. **1 353,6 кв. м; здание специализированное складов** с инв. № 350/С-225869 пл. **253,7 кв. м; здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей** с инв. № 350/С-117185 пл. **371,6 кв. м; здание многофункциональное** с инв. № 350/С-122651 пл. **609,3 кв. м, механическая мастерская по ремонту н/с оборудования** с инв. № 350/С-231509 пл. **278,2 кв. м, боксы для стоянки автомобилей** с инв. № 300/С-62004 пл. **703,8 кв. м, здание административно-хозяйственное** с инв. № 350/С-232061 пл. **780,0 кв. м).**
**Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000006000391** общей площадью **0,9889 га** – для строительства и обслуживания здания многофункционального, здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ и здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции). **Право аренды (доля в праве 999/1000).**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Мозырская, 14.
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.04.2025 г.
**Начальная цена с учетом НДС 20 % со снижением на 20 %: 1 535 136,00 бел. руб.**

**ЛОТ № 2. Административное здание** общей площадью **70,9 кв. м,** год постройки 2008. Составные части и принадлежности: **пристройка** пл. застройки **2,0 кв. м, склад** пл. застройки **16,0 кв. м, склад** пл. застройки **29,0 кв. м, ворота металлические (ширина 4,27 м), забор деревянный (длина 272,67 м).**
**Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Шарпиловский с/с, д. Шарпиловка, ул. Советская, 211А.
**Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321089803601000181** общей площадью **0,4808 га** – для обслуживания производственной базы. **Право постоянного пользования.**
**Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Шарпиловский с/с, д. Шарпиловка, ул. Советская, 211А. Реализация объекта проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 330 от 19.09.2022 г. «О распоряжении имуществом». С перечнем имеющейся документации на лот № 2 потенциальный покупатель может ознакомиться у организатора аукциона.
Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 06.06.2025 г.
**Начальная цена с учетом НДС 20 % со снижением на 10 %: 6 480,00 бел. руб.**

Задаток **5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с **Продавца (ОАО «Гомельдрев»):** р/с BY58 AKBB 3012 0212 1501 6310 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 400021353, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №№ 1, 2 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса»

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | В рабочие дни по предварительному согласованию **8 (029) 645-93-51, Андреев Глеб Геннадьевич** |

Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола.
**Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи.** Рассрочка оплаты стоимости приобретенного имущества предоставляется по письменному заявлению Победителя аукциона (Претендента на покупку) в соответствии с законодательством. Имущество, проданное с рассрочкой оплаты, находится в залоге у Продавца для обеспечения исполненной Покупателем обязанности по оплате его цены в соответствии с заключенным договором купли-продажи. Передача имущества Покупателю будет осуществляться после полной оплаты цены продажи объекта. Проводится аукцион в соответствии с Положением ЗАО «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов: **https://ocenkaservis.by (раздел Очные торги»), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». Организатор аукционных торгов: ☎ 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89. E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30 (тридцать) календарных дней после проведения аукциона** |

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует**

В информацию о проведении электронных торгов (03.10.2025) по продаже имущества, принадлежащего Минскому вагонному участку УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» (УНП 100016951), опубликованную в газете «Звязда» от 03.09.2025, вносятся изменения: **начальную цену лотов читать как:**

| Лот № | Наименование (модель) | Начальная цена без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Пассажирские вагоны с тележкой узкой и широкой колеи:** | | |
| 1 | РИЦ № 013-02363 МОДЕЛЬ 3.572 | 1 170 000,00 |
| 2 | РИЦ № 013-02371 МОДЕЛЬ 3.572 | 1 170 000,00 |
| 3 | РИЦ № 013-02389 МОДЕЛЬ 3.572 | 1 170 000,00 |
| 4 | РИЦ № 013-02397 МОДЕЛЬ 3.572 | 1 430 000,00 |
| **Пассажирские вагоны без тележки узкой колеи:** | | |
| 5 | РИЦ ТИП Z1 № 013-02439 МОД. 305Ad2 (ВЛАБ РИЦ) | 2 450 000,00 |
| 6 | РИЦ ТИП Z1 № 013-02447 МОД. 305Ad2 (ВЛАБ РИЦ) | 2 450 000,00 |
| 7 | **Тележки вагонные GP-200N ВЛАБ РИЦ-200** (4 шт.) | 112 000,00 |

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Госкомимущества

**Контактный телефон** +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by

УНП 191021390

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

**«В ПОИСКАХ СОКРОВИЩ»**

**Сведения об Организаторе рекламной игры:** общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 года Минским горисполкомом.

**Местонахождение Организатора:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

**Наименование рекламной игры:** «В поисках сокровищ».

Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, выдано Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры от 08.05.2025 № 4537.

Период проведения рекламной игры: с 01.06.2025 по 08.10.2025.

Количество участников рекламной игры составило 15 130 человек.

Розыгрыши призов были проведены 18 июня 2025 г. в 12.00, 02 июля 2025 г. в 12.00, 16 июля 2025 г. в 12.00, 06 августа 2025 г. в 12.00 и 06 августа 2025 г. в 12.30 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

**Победители, выигравшие Призы**

**Деньги:** Денежная сумма 10 000 BYN стоимостью 10000,00 (десять тысяч) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 1459,89 (одна тысяча четыреста пятьдесят девять) белорусских рублей 89 копеек: Грицкевич А.А.

**Приставка:** Игровая приставка Microsoft Xbox Series S 512Gb 1883 / RRS-00010, страна-производитель Китай, стоимостью 1490,00 (одна тысяча четыреста девяносто) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 188,28 (сто восемьдесят восемь) белорусских рублей 28 копеек: Козловский П.К., Холод А.С., Комарова Т.С., Коваленко А.Н.

**Велосипед и шлем:** Комплектующие НВНС Велосипед DeltA Велосипед DeltA Street 27.5 2701 (16, красный) страна производства CN и Защитный шлем FAVORIT IN20-L-RD, страна производства Тайвань стоимостью 690,00 (шестьсот девяносто) белорусских рублей 00 копеек + денежные средства в размере 68,74 (шестьдесят восемь) белорусских рублей 74 копейки: Амбражевич О.В., Кожемякина А.В., Пастернакевич А.В., Данилович Е.А.

**Яндекс станция:** Колонка звуковая Яндекс Станция Лайт стоимостью 178,00 (сто семьдесят восемь) белорусских рублей 00 копеек: Гришина О.А, Семёнова П.А., Мазаник А.В., Тесленок Т.В., Кухарёнок А.Н., Русак И.Н., Яковишен А.А., Тарасевич С.А., Бакан К.Н., Почетовская Н.Ю., Валько А.А., Костусева О.С., Емельяненко А.С., Дятко А.Е., Тарасов М.А., Черненкова Т.Л., Позднякова А.Е., Нестерук А.В., Радченко М.В., Тихомай П.С., Хмелевская В.М., Миклашевич В.Г., Касабуцкий А.М., Гулевич В.А., Карпович А.Э., Танана Т.И., Лапицкая Н.В., Литвин Н.А., Скрицкий В.С., Красковский А.Ч., Чукан В.С., Супиченко Н.В., Древило Н.В., Чудиловская О.О., Войткун Р.И., Ребенок В.П., Гончарова А.Г., Бойко Ю.Ф., Журавлева Е.С., Павловская Ю.С., Мурга А.Э., Ковалевская Л.Р., Болбас Л.М., Васько Д.Н., Гринкевич С.В., Строк В.М., Дорогуш В.А., Кузьмина Т.Б.

**Наушники:** Наушники JBL Tune 510BT стоимостью 150,00 (сто пятьдесят) белорусских рублей 00 копеек: Щаврович А.А., Чаховская Ю.А., Колбик Е.А., Абакелия А.В., Левин В.Б., Бутлова М.Н., Антонова К.М., Козлов А.А., Песецкий Д.А., Бачище О.Г., Шонина Е.И., Латышева А.М., Кадушкина А.А., Белов Н.Н., Синявский А.В., Дешук А.А., Смолко И.А., Романова Е.В., Иванова Е.А., Дубовик А.Г., Атращенок М.В., Дудник А.Л., Василевский С.В., Кирдун Я.С., Беляй Т.В., Ворник П.С., Зинович К.С., Харченко И.Л., Торгашина Н.В., Квасов В.А., Абраменя Ю.В., Логвиненко Д.В., Роля Д.О., Козел А.Г., Хомиченко И.Ю., Микулич Е.А., Буткевич С.М., Лось Е.А., Бохан Д.И., Мальцева О.И., Чудакова О.С., Хомич И.Ю., Колчанова И.Н., Дубовец С.М., Леонова О.И., Лукштинская К.О., Логиновский С.Р., Бирюкова Ю.Г.

**Победители Приза «Рюкзак с наполнением 1»:** Рюкзак Simplicity, Бейсболка (кепка классическая), Значок, Стикерпак 90х90 мм полимерный 3Д (4 элемента), 4+0, Республика Беларусь, стоимостью 59,50 (пятьдесят девять) белорусских рублей 50 копеек: **в количестве 260 шт. указаны на сайте igra.mishutka.by**

**Победители Приза «Рюкзак с наполнением 2»:** Рюкзак Simplicity; Бутылка для воды «Bottle C1», soft touch, 600 мл, оранжевый; Значок; Стикерпак 90х90 мм полимерный 3Д (4 элемента), 4+0 Республика Беларусь стоимостью 64,30 (шестьдесят четыре) белорусских рубля 30 копеек: **в количестве 260 шт. указаны на сайте igra.mishutka.by**

**Призовой фонд разыгран полностью.**
Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375336961716.
Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 95 (30483) от 20.05.2025 г.



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ГУ «Воложинский районный центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций»** (Продавец) на праве оперативного управления.

**Электронные торги состоятся 03.10.2025.**

**Лот № 1:** GAZ-3302,
кузов (рама) № Y3H232500A0055188, 33020092379282.

Начальная цена без НДС – 10 000,00 руб.

Местонахождение: Минская обл. Воложинский район, г. Воложин, ул. Партизанская, 15.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by**, Минского областного исполнительного комитета **minsk-region.gov.by** и на электронной торговой площадке «GOSTORG» **gostorg.by.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182


# «УПЛЫЎ ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ СТВАРЫЛІ СВАЕ ЛЕКАВЫЯ ІМПЕРЫІ, МЫ АДЧУВАЕМ ДАГЭТУЛЬ»

## Згадаем таго ж Ракфелера...

Пасля пачатку прамысловай рэвалюцыі з'явіліся людзі, у якіх назапасілася грошай больш, чым на самай справе неабходна для камфортнага існавання. Грошы сталі кіраваць палітыкамі і іншымі ўплывовымі асобамі. А людзі, якія імі валодалі ў неабмежаванай колькасці, па сутнасці, вырашалі за астатніх, што трэба рабіць і як правільна сябе паводзіць. Да чаго гэта ў выніку прывяло і ці ўплывае гэта цяпер на нас? Аб гэтым размаўляем з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гуменам ГАРБАННІДЖАДАМ.



Уінстан Чэрчыль аднойчы трапна прыкмеціў: «Улада — гэта наркотык. Хто паспрабаваў яго хоць раз — атручаны назаўжды». Увогуле, імкненне да яе можа быць як станоўчай, так і адмоўнай з'явай. Тыя кіраўнікі, чый досвед кіравання аказаўся станоўчым, назаўжды запомняцца як служыцелі свайму народу, сваёй краіне. Імкненне да ўлады таксама можа быць матываванае дасягненнямі і лідарствам, а ў выніку прыводзіць да маніпуляцый і злоўжывання. Сярод прыкладаў — Чынгісхан, Напалеон Банапарт, якія імкнуліся захапіць увесь свет. Аднак дзеля гэтага зусім неабавязкова ваяваць — ёсць і іншыя метады. Адзін з іх — стварэнне імперыі. Уплыў на міжнародную палітыку людзей, якія вырашылі пайсці менавіта такім шляхам, мы адчуваем дагэтуль. Гэта вядомыя Томас Хант Морган, Генры Форд, Джон Дэвісан Ракфелер. Пра апошняга з іх, чыё прозвішча стала назоўнікам агульным як абазначэнне вялікага багацця, мы і гаварылі з доктарам Гуменам. Чаму менавіта пра яго? Аказваецца, нафтавы магнат меў непасрэднае дачыненне да медыцыны і фармацэўтыкі.

— Амерыканскі прадпрымальнік Ракфелер у 1900 годзе кіраваў амаль 90 % нафтавага рынку, быў фактычна яго манапалістам. Не тое каб усе надта любілі Ракфелера, хутчэй яго грошы, якімі ён, дарэчы, шчодра дзяліўся з навакольнымі, каб пашыраць сваю імперыю, хаця сам па сабе быў чалавекам вельмі прагным. Хацеў стаць манапалістам пітной вады, кіраваць усімі ўрачамі і лекамі, — расказвае суразмоўца. — Прадпрымальнік нават выступаў за легітымізацыю абортаў, лічачы, што дзеці са слабым генам не маюць права на жыццё. І нават калі чарговая ідэя (а іх было шмат) Ракфелера не мела ніякага навуковага абгрунтавання, яе спяшаліся рэалізаваць, бо гэта ж магнат, кіраўнік імперыі...

***— Хаця кіраўнікі імперый — такія ж людзі, як мы ўсе. Улада і грошы — тое адзінае, што нас адрознівае...***

— Абсалютна так. Калі ў 1901 годзе адкрыўся Ракфелераўскі ўніверсітэт, быў пакладзены пачатак лекавай імперыі. З усяго свету запрашаў ён туды найлепшых вучоных і ўрачоў на працу. Каля 100 мільёнаў долараў на той час інвеставаў у гэтую ўстанову. Наёмныя работнікі ведалі, што іх работадавец — чалавек уплывовы, багаты, таму падпарадкоўваліся яго строгім законам.



Палітыкі былі таксама пад уплывам грошай Ракфелера. І замест работы на карысць сваіх краін і народаў лічылі заробленае. Менавіта з дапамогай іх Ракфелер мог прымаць выгадныя законы. У прыватнасці, сутнасць аднаго з іх заключалася ў тым, што ўрачы не мелі права выкарыстоўваць самаробныя лекі — толькі з фармацэўтычных заводаў, гаспадаром якіх ён уласна і быў.

Яшчэ адзін немалаважны гістарычны факт: у 1909 годзе Ракфелер пазнаёміўся, а ў далейшым і супрацоўнічаў з Абрахамам Флекснерам, які прысвяціў жыццё ўдасканаленню сістэмы медыцынскай адукацыі ў Злучаных Штатах, хаця сам быў спецыялістам у галіне тэорыі адукацыі. Карацей, чалавек, які да медыцыны не меў ніякага дачынення, вырашаў, што ўрачы ведаць павінны, а што — не.

Вось і атрымалася замкнёнае кола. Спачатку некім рэгулюецца атрыманне медыцынскай адукацыі, урач згодна з пратаколам назначае лекі пэўнага вытворцы... Іншага выйсця няма. У інстытуце, якім кіраваў Ракфелер, нічога звышнатуральнага не адбывалася: збіраліся найлепшыя вучоныя, фармацэўты, урачы з усяго свету і стваралі лекі. Здавалася б... Але выпускаліся з іх толькі тыя, ад якіх чалавек залежаў, іншыя не патрэбны.

Імперыю ў Злучаных Штатах з часам неабходна было пашыраць, таму яе ўплыў пачаў распаўсюджвацца і на Еўропу. Ракфелер у якасці гуманітарнай дапамогі выдзяляў медыцынскім універсітэтам грошы, а тыя ў сваю чаргу павінны былі падпарадкоўвацца законам вядучай імперыі. Гэта можна лічыць своеасаблівым хабарам. Праводзілася палітыка накшталт «вы або з намі, або супраць нас».

Безумоўна, вялікі ўплыў аказала таксама з'яўленне псеўдавучоных, якія хутчэй шукалі адказ на пытанне «Чаму не атрымалася?», чым імкнуліся адкрываць нешта новае. Іх рэгулятарам і цяпер з'яўляюцца акадэміі навук некаторых краін, на падтрымку якіх Ракфелер у свой час грошай не шкадаваў. Часта бывае, калі ад гэтых устаноў у краінах, якія развіваюцца, чакаюць дасягненняў, але беспаспяхова. Бо, аказваецца, гэта не зусім іх функцыі.

У 1913 годзе ў ЗША рэзка павялічылася колькасць хворых на рак. Ракфелер і ў гэтым выпадку не ўпусціў магчымасць і адкрыў яшчэ Асацыяцыю раку. Лячылі там людзей зноў жа толькі тымі лекамі, якія выпускала яго імперыя.

***— І сёння сіла гэтай імперыі ўсё яшчэ мае нейкі ўплыў на людзей?***

— Безумоўна. Калі Ракфелер пастарэў, улада апынулася ў руках яго сына, які ўкладваў грошы ў нямецкі IG Farb. Ён жа быў гаспадаром фірмы Bayer, якая на той час лічылася ледзь не сатаніцкай. Яна ў сваю чаргу фінансавала дзейнасць фашысцкага доктара Ёзэфа Менгеле, якога яшчэ называлі «анёлам смерці» з-за нечалавечых доследаў, якія ён праводзіў на вязнях канцлагера Асвенцім падчас Другой сусветнай вайны...

У 1991-м, калі распаўся Савецкі Саюз, англасаксы і іншыя імперыі сталі лічыць сябе абсалютнымі пераможцамі над ім. Гэта праўда, што ядзерную дзяржаву нельга перамагчы на полі бою. Каб разваліць яе, трэба было запусціць шмат рычагоў. Фармацэўтычная мафія на постсавецкай прасторы са страшнай сілай і хуткасцю ўкараняла сваіх людзей і ў выніку знайшла сваіх паслядоўнікаў. Безумоўна, за грошы. І гэта, на вялікі жаль, у многіх рэспублік постсавецкай прасторы да гэтага часу выклікае тармажэнне развіцця медыцыны і навукі. Бо, па-першае, палітыкі, як правіла, не з'яўляюцца вучонымі і ўрачамі — іх веды абмежаваныя. Па-другое, грошы аказваюць на іх вялікі ўплыў. Беларусі, якая ідзе самастойным шляхам, у тым ліку і ў развіцці медыцыны, падобны заганны ўплыў, на шчасце, не пагражае.

Увогуле, любая дзяржава абапіраецца на пэўны фундамент. Адзін з яго складнікаў — медыцына і ахова здароўя. Самі разумеем: хворым людзям і вайны не трэба. Небяспека ўплыву лекавай імперыі заключаецца яшчэ і ў тым, што яе кіраўнікі самі вырашаюць: каго лячыць, а каго — не. Калі раптам трапіць у гэтае замкнёнае кола, з яго немагчыма будзе вырвацца.

...А яшчэ як медык скажу банальную, але важную рэч: не спяшайцеся абвінавачваць у сваім дрэнным самаадчуванні сусветную мафію або яшчэ каго-небудзь... У першую чаргу варта прытрымлівацца здаровага ладу жыцця.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

# КАРАЛЕВА ПРЫГАЖОСЦІ

## Карону «Міс Беларусь» заваявала васямнаццацігадовая жыхарка Полацка

Пераможцай Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь — 2025» стала Алена Кучарук з Полацка. Дзяўчына не магла стрымаць слёз радасці. Са сцэны яна выказала словы ўдзячнасці перш за ўсё любімай маме, а таксама арганізатарам конкурсу і членам журы. І прызналася: «Я сама ў сябе не верыла!».




Міс Беларусь падзялілася: думак пра тое, што выйграе галоўны тытул, у яе не было.

— Часам яны з'яўляліся, але я адразу ж адганяла іх, таму што для мяне гэта было быццам нерэальна!

Карону Алена прымала ў фантастычнай прыгажосці вячэрняй сукенцы, у якой удзельнічала ў фінальным дэфіле. У завяршальным выхадзе гэтай феерыі прыгажосці ў неверагодна прыгожых сукенках зіхацелі ўсе фіналісткі: па ўжо існуючай традыцыі вячэрнія сукенкі, у якіх яны з'явіліся на подыуме, ім паднёс у падарунак кіраўнік дзяржавы, які прысутнічаў на фінале «Міс Беларусь — 2025». Прысутнасць Прэзідэнта на гэтым мерапрыемстве стала традыцыйнай, што сведчыць аб высокім статусе конкурсу для ўсёй краіны.

Ідэя фінальнага шоу «Сусвет прыгажосці» была звязана з прыгажосцю як натхняльнай сілай для здзяйсненняў і творчых перамог. Сведчанне непадробнай цікавасці да конкурсу ў беларускім грамадстве — тысячы гледачоў, групы падтрымкі прэтэндэнтак на карону галоўнай прыгажуні Беларусі, дзяржаўныя, грамадскія дзеячы, медыйныя персоны ў зале.

За перамогу ў конкурсе прыгажуні дасталася не толькі карона, але і грашовы прыз, а таксама аўтамабіль Geely.

### ШТО МЫ ВЕДАЕМ ПРА НОВУЮ «МІС БЕЛАРУСЬ»?

Нарадзілася Алена Кучарук у Данецку, але ўжо шмат гадоў жыве ў Полацку. Яна студэнтка Наваполацкага дзяржаўнага музычнага каледжа, вучыцца на спецыяльнасці «Дырыжыраванне (акадэмічны хор)».

— З дзяцінства займаюся вакалам. І, шчыра кажучы, думала, што апынуся на вялікай сцэне, але дзякуючы вакалу. А дзякуючы знешнасці — гэтага не чакала, — сказала «Міс Беларусь — 2025».

Мама Алены Кучарук працуе ў сацыяльнай сферы, яе старэйшая сястра — рэабілітолаг. Вырасла Алена ў Полацку.

— Мая мама беларуска, — распавяла яна. — Мы прыехалі з Данецка да бабулі на лета, як рабілі часта. Мая бабуля жыве ў Полацкім раёне, у аграгарадку Гараны. За лета мама зразумела, што не хоча рызыкаваць дзецьмі, і мы вырашылі застацца тут. А тата застаўся там.

Тады будучай «Міс Беларусь» было ўсяго сем гадоў. Сувязі з роднымі з Данецка не засталося, расказала яна. Беларусь стала для Алены роднай.

— Я вельмі люблю нашу краіну, — прызналася прыгажуня. — Мне здаецца, што, калі ў чалавека ёсць жаданне, ёсць мэты, тут можна дасягнуць абсалютна любых вышынь.

У найбліжэйшых планах Алены — з гонарам несці заваяваны тытул і выконваць усе місіі «Міс Беларусь», а таксама пасля заканчэння каледжа паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову і потым самарэалізавацца ў прафесіі. Дзяўчына не ўяўляе жыццё без музыкі, яна займаецца вакалам, іграе на фартэпіяна.

— Мая душа ляжыць да музыкі з самага дзяцінства. Мне здаецца, музыка, мастацтва павінны жыць у кожным чалавеку, — лічыць яна.

Алена распавяла журналістам, як адчувае сябе ў новым статусе:

— Падрыхтоўка была вельмі доўгай. Я б не сказала, што я першая прыгажуня. Так, я валодаю гэтым тытулам. Але гэта не значыць, што я самая прыгожая. Кожная дзяўчына па-свойму ўнікальная. І мне здаецца, што любы чалавек прыгожы.

Трэба сказаць, што ўладальніцу тытула «Міс Беларусь — 2025» журы выбірае з фіналістак, якія прайшлі адборачныя туры спачатку на рэгіянальным, а потым на абласным і мінскім гарадскім этапах. Усяго ў адборы сёлета прынялі ўдзел 854 дзяўчыны, а ў фінал трапілі 24 удзельніцы. На подыум у Палацы спорту, праўда, выйшлі 23 прыгажуні (адна фіналістка не змагла прысутнічаць па стане здароўя). Падтрымкай і апорай падчас усяго гэтага марафону для Алены Кучарук стала яе мама.

— Я ўдзячная ўсім канкурсанткам, якія былі са мной у фінале, тэлеканалу АНТ. Я была ўдалечыні ад дома, хацелася абняць маму, калі вельмі стамлялася. Але ў мяне была, напэўна, мая другая сям'я: магла падзяліцца перажываннямі з дзяўчатамі. Лічу, гэта шмат чаго каштуе, — падкрэсліла прыгажуня.

Сэрца «Міс Беларусь» пакуль вольнае, падзялілася дзяўчына з журналістамі.

— Думаю, мне яшчэ рана для адносін. Усяму свой час.

### НА ШТО ЗВЯРТАЛА ЎВАГУ ЖУРЫ?

Сёлета ў журы конкурсу ўвайшлі міністр інфармацыі Марат Маркаў, оперны выканаўца народны артыст Беларусі Уладзімір Громаў, заслужаны майстар спорту, сярэбраны прызёр зімовых Алімпійскіх гульняў 2022 года, біятланіст Антон Смольскі, кінарэжысёр-пастаноўшчык Кірыл Халецкі, старшыня Цэнтральнага савета Беларускага фізкультурна-спартыўнага таварыства «Дынама» Дзмітрый Балаба, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуць, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый Баскаў, уладальніца тытула «Міс Беларусь — 2023» Элеанора Качалоўская. Гаворачы аб крытэрыях работы журы, Дзмітрый Балаба адзначыў, што стараўся кіравацца спартыўнымі прынцыпамі сумленнай барацьбы. Але выбар быў няпросты: усе фіналісткі вельмі прыгожыя.

— Заўсёды захапляўся прыгажосцю нашых беларускіх жанчын, — сказаў ён.

Уладзімір Громаў падкрэсліў, што асаблівую ўвагу звяртаў на вочы ўдзельніц, бо менавіта па іх святле можна вызначыць, чым чалавек жыве і што нясе ў свет. Ён дадаў, што «не ўсіх любіць камера»: адна справа — калі глядзіш на чалавека на подыуме, і іншая — конкурс паказваюць па тэлебачанні.

І яшчэ адзін важны нюанс — як удзельніцы спраўляюцца з хваляваннем. Умець утаймаваць эмоцыі на сцэне неверагодна важна, бо на «Міс Беларусь» — сур'ёзная адказнасць: яна будзе прадстаўляць краіну і несці ганаровае званне «Міс Беларусь» за яе межамі.

**Падрыхтавала Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | **Изолированное помещение с инв. № 500/D-1002997,** расположенное по адресу: г. Минск, ул. Седых, д. 66, пом. 1. Площадь – 1422,0 кв. м. Наименование – Спортивный комплекс, расположенный на 1-м и 2-м этажах (пристройка к средней школе № 114). Назначение – Помещение физкультурно-оздоровительного и (или) спортивного назначения. Обременение: аренда | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 184 400,00** | **Задаток, BYN** | **118 440,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 133 03 33 (Елена) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) в срок не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 30 сентября 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 09.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **01 октября 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего **Отделу идеологической работы, культуры и по делам молодёжи Воложинского райисполкома** (Продавец)
на праве оперативного управления.

**Электронные торги состоятся 03.10.2025.**

**Лот № 1:** GAZ 32213,
кузов (автобус вагон) № X9632213060454042.

Начальная цена без НДС – 5 100,00 руб.
Местонахождение: Минская обл. Воложинский район,
г. Воложин, пл. Свободы, 2.

**Лот № 2:** MAZ 256170,
кузов (автобус вагон) № Y3M25617080001017.

Начальная цена без НДС – 17 300,00 руб.
Местонахождение: Минская обл. Воложинский район,
г. Воложин, пл. Свободы, 2.

Извещение о проведении электронных торгов
размещено на сайтах Государственного комитета
по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by,**
Минского областного исполнительного комитета
**minsk-region.gov.by** и на электронной торговой площадке
«GOSTORG» **gostorg.by.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52;**
**torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Жлобине

| Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | **Аукцион состоится 30 сентября 2025 г. в 11.00** по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1)<br>Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» | | |
|---|---|---|---|
| **Номер лота** | 1 | 2 | 3 |
| **Наименование объекта/ адрес земельного участка** | **Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Радужная, 24 и земельный участок в частную собственность** | **Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, пер. Свободы 2-й (с готовностью 12 %) и земельный участок в частную собственность** | **Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Радужная, 27 (с готовностью 3 %) и земельный участок в частную собственность** |
| **Кадастровый номер участка** | 321850100001009738 | 321850100003002504 | 321850100001009598 |
| **Площадь, га** | 0,1004 | 0,0832 | 0,1060 |
